Мова
маёй зямлі
Дапанімічны слоўнік
Ляхавіччыны

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма»

Мова маёй зямлі

Тапанімічны слоўнік Ляхавіччыны

Ляхавічы
2021

Аб выданні 1, 2

1 – дадатковы тытульны экран – звесткі аб выданні

УДК 811.161.3
ББК 81.2Беи-3

Выданне падрыхтавана
дзяржаўнай установай культуры
“Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма”

Мова маёй зямлі: тапанімічны слоўнік Ляхавіччыны / Ляхавіцкая раён. цэнтраліз. бібл. сістэма. – Ляхавічы, 2021. – 68 с.

Кніга змяшчае навукова-папулярныя эцюды пра паходжанне назваў геаграфічных аб’ектаў Ляхавіцкага раёна. Пры назвах падаюцца геаграфічныя, гістарычныя, этнаграфічныя звесткі, народныя легенды і паданні, старажытныя і сучасныя іх варыянты, меркаванні наконт іх паходжання.

Для шырокага кола чытачоў.

Сістэмныя патрабаванні:
ПК 486 і вышэй ; 8 Мб АЗП ; Windows XP і вышэй ;
SVGA 32768 і болей колераў ; 640×480 ; 4x CD-ROM дыскавод ;
16-біт. гук. карта ; мыш ; Adobe Acrobat Reader.

© ДУК “Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, 2021

у пачатак ***уперад***

- Выданне створана на аснове Microsoft Word 2016, Adobe Acrobat XI Pro;
- Тэхнічны рэдактар: *Л. П. Мацулевіч*.

- Аб’ём выдання: 1,85 Мб;
- Камплектацыя: 1 электронны аптычны дыск (CD-R), дапаможнік карыстальніка, пластыкавая ўпакоўка і ўкладыш (12×12 см);
- Выдавец: Дзяржаўная ўстанова культуры “Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”, Рэспубліка Беларусь, Брэсцкая вобл., г. Ляхавічы, вул. Гагарына, 11.

у пачатак ***да зместу***

ПРАДМОВА

Прыгажосць нашай зямлі мае мноства граняў: і яркіх, і някідкіх. Адна з іх – тапанімічнае багацце Беларусі. У кожнага населенага пункта свая гісторыя і свой твар. Нават у назвах ёсць нешта таямнічае і зачаравальнае. Усё, што патрапіла ў поле зроку чалавека, атрымлівае імя. Найменне навакольнага – асноўная функцыя ў абжыванні прасторы, у яго “ачалавечванні”. Яны ўзнікалі ў канкрэтных гістарычных умовах, іх паходжанне цесна звязана з грамадскім жыццём народаў, якія насяляюць тыя ці іншыя мясцовасці. Гэта мова нашых продкаў.

З маленства мы запамінаем, як называецца луг каля ракі, поле, на якім працуюць бацькі, сцежка, што вядзе ў лес, а ён таксама мае сваю назву. І кожны з нас, відаць, задумваўся, чаму яны названы так, а не інакш.

Назва кожнай такой мясцінкі адметная, запамінальная. Калі называць яе па-навуковаму, то гэта гучыць так: мікратапонім – ад грэчаскага *мікрос* (“малы”) і *топос* (“мясціна”) + *оніма* (“імя”).

Ведаючы мікратапонім, можна беспамылкова трапіць у любое названае месца. Мяняюцца пакаленні людзей, сціраюцца з памяці розныя прадметы, бо выходзяць з ужытку, а назва застаецца, мы ёй карыстаемся, арыентуемся ў пэўным месцы.

Дадзены тапанімічны слоўнік з’яўляецца яшчэ адной невялікай старонкай гісторыі нашай малой радзімы, якая нам неабыякавая. У гэтым выданні вы сустрэнеце не толькі вядомыя геаграфічныя назвы, але і неафіцыйныя, тыя, якімі карысталіся нашы продкі і якія жывуць сёння ў мове мясцовага насельніцтва.

НАЗВЫ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ

Назва (белар.)	Назва (рус.)	Сельсавет
1[1]	*2*[2]	*3*
Адахаўшчына	Адаховщина	Навасёлкаўскі
Альхоўцы	Ольховцы	Альхоўскі
Асосы	Ососы	Ганчароўскі
Астрэйкі	Острейки	Жарабковіцкі
Бажкі	Божки	Навасёлкаўскі
Бенькаўцы	Беньковцы	Крывошынскі
Беражное	Бережное	Крывошынскі
Бярэзкі	Березки	Востраўскі
Вадзяціна	Водятино	Альхоўскі
Валасачы	Волосачи	Жарабковіцкі
Волька	Волька	Альхоўскі
Вонькі (з 1971 г. Набярэжная)	Воньки	Ганчароўскі
Востраў	Остров	Востраўскі
Вошкаўцы	Вошковцы	Навасёлкаўскі
Вялікае Гарадзішча	Большое Городище	Альхоўскі
Вялікае Падлессе	Большое Подлесье	Жарабковіцкі
Вялікая Лотва	Большая Лотва	Навасёлкаўскі
Гайнін	Гайнин	Ганчароўскі
Гайнінец	Гайнинец	Ганчароўскі
Галавачы	Головачи	Конькаўскі
Галаўнінцы	Головнинцы	Крывошынскі
Ганцавічы	Ганцевичи	Ганчароўскі
Ганчары	Гончары	Ганчароўскі
Гарадзішча	Городище	Ганчароўскі
Гарбачы	Горбачи	Навасёлкаўскі

[1] У калонцы нумар 1 прадстаўлены спасылкі на апісанне тапонімаў у тэксце.
[2] У калонцы нумар 2 прадстаўлены спасылкі на анлайн-карту Google.

у пачатак *да зместу*

Назва (белар.)	Назва (рус.)	Сельсавет
Гаслаўшчына	Гославщина	Начаўскі
Гасцілавічы	Гостиловичи	Альхоўскі
Гашчын	Гащин	Ганчароўскі
Гірыч-Поль	Гиричь-Поль	Навасёлкаўскі
Горка	Горка	Да 1972 г. у Начаўскім
Грудскія	Грудские	Да 1972 г. у Куршынавіцкім
Грушаўка	Грушевка	Начаўскі
Гукова	Гуково	Альхоўскі
Гулічы	Гуличи	Жарабковіцкі
Гута	Гута	Востраўскі
Дайнякі	Дойняки	Навасёлкаўскі
Дамашы	Домаши	Жарабковіцкі
Дарава	Дарево	Конькаўскі
Дарава-Чыж	Дарево-Чиж	Конькаўскі
Дзірван	Дирван	Да 1972 г. у Куршынавіцкім
Дубіна	Дубина	Навасёлкаўскі
Дрэкі	Дреки	Конькаўскі
Жарабковічы	Жеребковичи	Жарабковіцкі
Жарскія	Жарские	Начаўскі
Забер’е	Заберье	Востраўскі
Завінне	Завинье	Альхоўскі
Задвор’е	Задворье	Альхоўскі
Заліпенне	Залипенье	Крывошынскі
Залужжа	Залужье	Крывошынскі
Заполле	Заполье	Востраўскі
Зарытава	Зарытово	Жарабковіцкі
Зарэчча	Заречье	Конькаўскі
Зубелевічы	Зубелевичи	Жарабковіцкі
Кавалі	Ковали	Навасёлкаўскі
Канюхі	Конюхи	Жарабковіцкі

у пачатак *да зместу*

Назва (белар.)	Назва (рус.)	Сельсавет
Каранеўшчына	Кореневщина	Навасёлкаўскі
Карані	Корени	Навасёлкаўскі
Каўпакі	Колпаки	Крывошынскі
Конькі	Коньки	Конькаўскі
Крэглі	Крегли	Навасёлкаўскі
Крывое Сяло	Кривое Село	Альхоўскі
Крывошын	Кривошин	Крывошынскі
Кулікі	Кулики	Востраўскі
Куляні	Кулени	Ганчароўскі
Куршынавічы	Куршиновичи	Ганчароўскі
Лабузы	Лабузы	Конькаўскі
Ліпск	Липск	Крывошынскі
Літва	Литва	Конькаўскі
Літоўка	Литовка	Альхоўскі
Любейкі	Любейки	Востраўскі
Ляхавічы	Ляховичи	Горад з 1931 г.
Мазуркі	Мазурки	Ганчароўскі
Макееўшчына	Макеевщина	Навасёлкаўскі
Малое Гарадзішча	Малое Городище	Альхоўскі
Малое Падлессе	Малое Подлесье	Конькаўскі
Малышы	Малыши	Крывошынскі
Марынова	Мариново	Альхоўскі
Меляхі	Мелехи	Ганчароўскі
Мінічы	Миничи	Ганчароўскі
Мыслабаж	Мыслобож	Начаўскі
Мядзведзічы	Медведичи	Ганчароўскі
Набярэжная (да 1971 г. Вонькі)	Набережная	Ганчароўскі
Навасёлкі	1. Новосёлки	1. Навасёлкаўскі
	2. Новосёлки	2. Крывошынскі
Нача	Нача	Начаўскі
Нетчын	Нетчин	Крывошынскі

у пачатак *да зместу*

Назва (белар.)	Назва (рус.)	Сельсавет
Нівішча	Нивище	Ганчароўскі
Нізкія	Низкие	Ганчароўскі
Новыя Буды	Новые Буды	Ганчароўскі
Падбарочча	Подборочье	Ганчароўскі
Падлаззе	Подлазье	Востраўскі
Пад’язаўле	Подъязовле	Альхоўскі
Пастаўнік	Поставник	Навасёлкаўскі
Патапавічы	Потаповичи	Жарабковіцкі
Паўлюкоўшчына	Павлюковщина	Да 1972 г. у Начаўскім
Пашкоўцы	Пашковцы	Начаўскі
Перахрэсце	Перехрестье	Начаўскі
Петухоўшчына	Петуховщина	Альхоўскі
Пірштукі	Пирштуки	Жарабковіцкі
Прачакі	Прончаки	Навасёлкаўскі
Рагачы	Рогачи	Востраўскі
Рамашкі	Ромашки	Жарабковіцкі
Рачканы	Рачканы	Начаўскі
Русінавічы	Русиновичи	Начаўскі
Савейкі	Совейки	Ганчароўскі
Сакуны	Сакуны	Конькаўскі
Сваятычы	Своятичи	Жарабковіцкі
Свісткоўшчына	Свистковщина	Жарабковіцкі
Свянціцкія	Свентицкие	Да 1972 г. – у Начаўскім
Свяціца	Святица	Крывошынскі
Смаленікі	Смоленики	Ганчароўскі
Станчакі	Станчаки	Навасёлкаўскі
Стараселле	Староселье	Ганчароўскі
Старыя Буды	Старые Буды	Ганчароўскі
Стральцы	Стрельцы	Востраўскі
Сялявічы	Селявичи	Навасёлкаўскі
Тальмінавічы	Тальминовичи	Ганчароўскі
Таўкачоўка	Толкачёвка	Навасёлкаўскі

у пачатак *да зместу*

Назва (белар.)	Назва (рус.)	Сельсавет
Трабавічы	Трабовичи	Жарабковіцкі
Тращякоўцы	Третьяковцы	Востраўскі
Тумашы	Тумаши	Навасёлкаўскі
Туркі	Турки	Конькаўскі
Тухавічы	Туховичи	Востраўскі
Улазавічы	Улазовичи	Жарабковіцкі
Ураджайная (да 1971 г. – Вошкаўцы)	Урожайная	Навасёлкаўскі
Федзюкі	Федюки	Федзюкоўскі
Флер'янова	Флерьяново	Навасёлкаўскі
Хацяж	Хотяж	Ганчароўскі
Ціткаўшчына	Титковщина	Навасёлкаўскі
Цыгань	Цыгань	Ганчароўскі
Чвыры	Чвыри	Конькаўскі
Шавялі	Шевели	Жарабковіцкі
Шчаснавічы	Счастновичи	Начаўскі
Шчэрбава	Щербово	Крывошынскі
Яцкаўшчына	Яцковщина	Жарабковіцкі

у пачатак *да зместу*

ТАПОНІМЫ ЛЯХАВІЧЧЫНЫ

Прынятыя скарачэнні:
гідр. – гідронім
мікр. – мікратапонім

А

Абуховічы. *(мікр.)* Урочышча на поўдзень ад вёскі Тухавічы ў лесе. Урочышча атрымала назву ад прозвішча гаспадара – пана *Абуховіча*.

Агаціна возера. *(мікр.)* Невялічкі рукатворны вадаём каля вёскі Канюхі. Цераз дарогу знаходзіцца месца былой сушні, дзе сушылі і церлі лён. Пасля там пасялілася жанчына з імем Агата, якая трымала гаспадарку і карысталася гэтым возерам.

Адахаўшчына. Сярод жыхароў вёскі існуе паданне, што назва *Адахаўшчына* паходзіць ад прозвішча пана *Адахоўскага*, якому некалі належылі тутэйшыя землі. Адахоўскі меў вялікую гаспадарку, у якой працавалі жыхары навакольных вёсак Гарбачы, Гірыч-Поль, Залюбічы. Пан жа бавіў час, іграючы з суседзямі ў карты. Аднойчы ён прайграў усю сваю маёмасць, у тым ліку і вёску Адахаўшчына, пану Казіміру Рдултоўскаму [4, 18].

Азярыска. *(мікр.)* У Сваятычах – поплаў, які знаходзіцца паміж возерам і могілкамі.

Альхоўцы. Лічыцца, што хутчэй за ўсё назва вёскі паходзіць ад *вольхі* – дрэва, якое часта сустракаецца ў навакольных мясцінах [4].

Асада. *(мікр.)* Землі, якія ў час знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1931–1939) былі раздадзены польскім афіцэрам, што *аселі* тут (вёскі Жарабковічы, Сваятычы). Ёсць і іншая назва гэтага месца (для вёскі Сваятычы) – *букет*. Ад таго, што паабапал дарогі, якая сюды вядзе, растуць кусты бэзу.

Аселіца. *(мікр.)* Балота, якое знаходзіцца па правы бок ад дарогі з вёскі Задвор'е ў вёску Петухоўшчына.

Асосы. Паводле расказаў мясцовых жыхароў, савейкаўскі пан за добрую працу некалі выдзяліў двум парабкам кусок зямлі, даў ім прозвішча *Асос*, а тую мясціну назваў Асосы.

Астрэйкі. Назва вёскі Астрэйкі сугучная слову "*астраўкі*". У аснове гэтых слоў прыгадваецца агульнае "*востраў*". Відаць, і на самай справе тыя "астраўкі" – кавалкі зямлі, адваяваныя людзьмі ў балоцістых ці нізінных мясцін для вырошчвання збажыны і агародніны, падказалі людзям так назваць сваю вёску. Калі добра прыглядзецца да яе месцазнаходжання, то ў гэтым проста ўпэўніцца. З паўночна-ўсходняга боку населены пункт апаясваецца вусцем рэчкі Шавялёўка з шырокім долам, які ў даўнія часы быў, пэўна, балотнай дрыгвой. З паўночна-заходняга – таксама нізіна. У такім нізінным акружэнні землі, дзе размешчана вёска, і сапраўды здаваліся астраўкамі на сушы. Адсюль і назва вёскі трансфарміравана са слова *астраўкі*. Сёння ў Астрэйках ніхто не пражывае, вёска лічыцца скасаванай [3].

Б

Бадбуда. *(мікр.)* Мясцовасць у напрамку ад вёскі Галаўнінцы ў вёску Стральцы, дзе некалі было поле. Паходжанне назвы мясцовым жыхарам невядома.

Баранья гара. *(мікр.)* Паша на захад ад вёскі Навасёлкі для выпасу авечак.

Барок. *(мікр.)* Высокае месца ў паўднёва-ўсходнім напрамку ад вёскі Навасёлкі, на якім у даўнія часы быў невялічкі дубовы лясок.

Бекін. *(мікр.)* Неафіцыйная назва вёскі Галаўнінцы, якая была распаўсюджана сярод жыхароў суседніх вёсак.

Белы луг. *(мікр.)* Так называюць лугавіну непадалёку ад вёскі Русінавічы. Нізкае, балоцістае месца са шматлікімі азёрамі-стаўкамі. Па легендзе на гэтым месцы раней знаходзілася сяло. У адзін з гарачых летніх дзён на вуліцы з’явіўся невысокі сівы дзядок. Ён прасіў ежы і напіцца вады. Але ніхто на яго не звярнуў увагі, бо былі заняты працай. Усё ж адна жанчына, трымаючы за руку дзіцё, дагнала яго і дала кавалак хлеба і збан вады. Узяў дзядок ваду, падзякаваў жанчыне і дадаў: “А зараз ідзі адгэтуль і не азірайся, бо толькі ты адна са сваім дзіцем выратуешся”. Пайшла напалоханая жанчына па прагоне ад вёскі, а ў галаве яе стукала думка аб астатніх дзетках, аб сем’ях, аб аднавяскоўцах. Невытрымала яна і азірнулася. У гэты ж момант жанчына ператварылася ў вялізны валун. Каменем стаў і яе сынок. Дзядок жа раптоўна знік. Паспелі вяскоўцы ўправіцца да навальніцы, вясёлыя вярталіся дамоў. Павячэраўшы, стомленыя людзі моцна спалі і не чулі, як пачалася навальніца. Усю ноч паліла маланка, грукатаў гром, як з вядра ліў дождж. Калі раніцай узыграла сонца, на месцы, дзе яшчэ ўчора было сяло, стаяла возера – усё было пахавана пад вадой у тую жудасную ноч, ніхто не ўратаваўся. Хутка вада зышла, і на гэтым месцы ўтварыўся травяністы луг. Раніцай там з’яўлялася такая вялікая раса, што здалёк луг выглядаў белым, як узімку. Адсюль і пайшла яго назва. Два ж камяні (вялікі і маленькі) так і працягвалі ляжаць разам на прагоне. Старыя людзі казалі, што аднойчы вясковы пастух, які

пасвіў у тым месцы кароў, сцебануў па гэтых камянях пугай і на іх выступіла кроў.

Бобрык. *(гідр.)* У рацэ некалі сяліліся бабры, перагароджваючы сваімі плацінамі русла ракі [14].

Брады. *(мікр.)* Мясцовасць недалёка ад вёскі Галаўнінцы, раней там некаторыя жыхары смалілі гусей, пасвілі жывёлу.

Буды. Першапачатковы сэнс слова, ад якога, магчыма, паходзіць назва вёскі, – асобны невялікі будынак, будка. У такіх стаяўшых у лесе будынках жылі буднікі, якія займаліся выпальваннем паташу. Гэта магла быць і вартавая будка каля гасцінца, чыгункі, кар'ера. Адным словам, назва Буды сведчыць аб тым, што вёска выросла вакол часовага збудавання [4].

Буракоўцы. *(мікр.)* Месца каля вёскі Канюхі, дзе некалі быў панскі двор.

Быкша. Поле паміж вёскамі Валасачы і Станчыкі, назва ад прозвішча былога ўладальніка – *Быкшы*.

Бязухава (бязвухага) лес. *(мікр.)* Невялікі кусок, лапік лесу ля сядзібы чалавека па мянушцы *Бязвухі* на паўднёвы ўсход ад вёскі Русінавічы, непадалёку ад вёскі Жарскія. Гаспадара сядзібы празвалі *Бязвухі*, таму што ён служыў у кавалерыі і яму конь на вайне адкусіў вуха.

Бялёў. *(мікр.)* Урочышча каля вёскі Тухавічы, атрымала назву ад прозвішча *Бялёў*.

Бярэзкі. Існуе версія, што калі пры Кацярыне II будавалася дарога з Масквы ў Варшаву, каб салдаты маглі спыніцца і адпачыць, тут былі ўзведзены тры хаты ў выглядзе казармаў. А пабудавалі іх у бярозавым гаі, дзе было светла і добра, а вясною можна было нагатаваць бярозавага соку. І таму гэтаму паселішчу далі назву Бярэзкі. Распаўсюджаны мікратапонім.

Бярэзнік. *(мікр.)* Месца размяшчэння Дамашоўскай царквы і могілак у вёсцы Сваятычы, вакол якіх расло шмат дробнага бярэзніку.

В

Вазакоў лужок. *(мікр.)* Лужок, нізкае месца ў полі каля вёскі Русінавічы. Ля лужка мелі свой надзел людзі па мянушцы *Вазакі*. Вазакамі іх называлі, таму што яны мелі добрага, цяглавітага каня, які мог перавозіць шмат дроў.

Вайтэляўшчына. *(мікр.)* Сенажаць у пойме ракі Шчара на захад ад вёскі Мыслабаж.

Валасачы. 1) Назва вёскі з'яўляецца вытворнай ад прозвішча *Валосавіч, Валасовіч*. Калі брать за аснову корань "*волас*", то трэба лічыць, што збліжэнне назвы з бытавым словам "*валасы*" малаверагодна з-за несумяшчальнасці паняццяў, якія выражаны. Верагодна, балтыйскае афармленне асновы "*вал*" з наступнай славянскай асіміляцыяй [18].

2) Жыў даўным-даўно чалавек, якому па службе прыходзілася аб'ездзіць не адну вёску, не адно мястэчка. Колькі за гэты час ён усяго пабачыў, пачуў: і добрага, і дрэннага, і сур'ёзнага, і жартоўнага. А колькі людзей ўсялякіх сустракаў – цяжка палічыць. Што ні вёска, то штосьці сваё тут. Кінулася яму ў вочы такая прыкмета – паўсюдна мужыкі мелі валасы коратка падстрыжаныя, а тут дык наадварот – доўгія, па самыя плечукі. Ці такая завядзёнка, ці не было свайго чалавека, які мог акуратна пастрыгчы, ці былі настолькі занятыя, альбо ленаваліся? Адным словам, "*валасачы*". Так і перадалася вёсцы гэта назва [3].

Ванячка. *(мікр.)* Невялікі вадаём у лесе каля вёскі Канюхі. Назва пайшла з-за стаячай вады, якая мае непрыемны пах.

Ведзьма. *(гідр.)* 1) Паходзіць ад старажытнага слова латышоў “*выдмяе*” – рака жоўтага пяску [10].

2) Назва відавочна пераасэнсаваная; у мінулым, верагодна, *Ветьма*. Размяшчаецца ў вобласці выяўленай балтыйскай тапаніміі, таму заканамерна выказаць здагадку пра балтыйскае паходжанне, супастаўнае з старажытнарускім *Weytimis* [18]. Само слова *веть* – стараславянскага паходжання і ў дачыненні да ракі пазначае такое паняцце, як “*адгалінаванне, галіна*”. Рака *Ветьма*, як і Уша, бярэ пачатак у нізінных месцах Нясвіжскага раёна. У старажытнасці Уша адводзіла сваёй воднай дарогай на поўнач, а *Ветьма* – на поўдзень. Гэта значыць, рэкі разыходзіліся ў процілеглых накірунках. У канчатковым рахунку абедзве ўпадалі ў вялікі Нёман, адводзілі ў Балтыйскае мора. Таму там, на балотах Нясвіжа, у купцоў і ўсіх тых, хто прыбываў з Прычарнамор’я, меўся выбар – альбо рухацца ў Нёман па Ушы, альбо па *Ветьме* [21].

3) Існуе паданне пра трагічную гісторыю, паводле якога ляхавіцкі князь Рацібор закахаўся ў Чараўніцу-Прыгажуню Чарнаву. Аднак мудрая Барыслава, маці Рацібора, зразумела, што калі захоча, стане Чараўніца-Прыгажуня гаспадыняй над яе сынам, і скончыцца тады час улады Барыславы. Загадала яна воінам пазбавіцца ад дзяўчыны. Цёмнай ноччу тры маўклівыя коннікі пад’ехалі да хаты Чараўніцы-Прыгажуні. Яны ўвайшлі з пустымі рукамі, выйшлі з цяжкай ношай у мяшку. Сярод ночы ўскочыў з ложка князь Рацібор у хваляванні вялікім і адчуванні надыходзячай бяды. Ускочыў на каня, той панёс яго да знаёмай лясной хаткі. Ён адразу ўсё зразумеў, калі ўбачыў на падлозе змятую хустку ды разарваныя рабінавыя каралі. Ногі самі прывялі яго да ракі. Схіліўся князь над хуткай плынню, і тады здалося яму: зашаптала нешта голасам Чарнавы рачная вада. Ён зрабіў толькі адзін крок наперад. І не было нават усплеску. Быццам

у абдымкі каханай прыняла яго рака. У цішыні пад зорным небам быў чуваць толькі незвычайны шэпт вады ды рыданні Барыславы: “Навошта, сыне! О, гэтая ведзьма!”. І сёння нясе свае воды праз горад Ляхавічы невялікая рака, з даўніх часін называюць яе Ведзьмай. Кажуць, калі доўга стаяць ля вады, добра прыслухоўвацца, можна вылучыць ціхі пяшчотны шэпт двух галасоў: жаночага і мужчынскага [2].

4) Сваю незвычайную назву Ведзьма атрымала, відаць, ад непрадказальнага, таямнічага, злоснага нораву з аднаго боку, а з другога – па паданню: некалі людзі былі пераканаы, што ў прыбярэжных балоцістых зараснікаx хавалася днём чараўніца-ведзьма [14].

Відоляўкі. *(мікр.)* Месца каля вёскі Русінавічы, дзе цячэ рака Міхайлаўка і да яе ўпадзення ў Шчару. Раней не было хмызоў і лесу, быў далёкі прыгожы від на Шчару.

Візамшара. *(мікр.)* У Сваятычах – поле за Снаўскай вуліцай.

Вілкі. *(мікр.)* У Зубелевічах – балоцістая мясцовасць.

Восава. *(мікр.)* Урочышча на паўднёвы захад ад вёскі Тухавічы. Названа ад перавагі асіны ў ландшафце дадзенай мясцовасці.

Востраў. Асновай для назвы паслужыла слова “*востраў*”. Аднак сэнс яго ў старажытны перыяд быў інакшым, чым ў сучаснай беларускай літаратурнай мове (“частка сушы, з усіх бакоў акружаная вадою”). Яно шырока ўжывалася ў якасці земляробчага тэрміна. Ва ўмовах лясіста-балоцістай мясцовасці людзі шукалі прыдатных для распрацоўкі мясцінак (астравоў і палянак) сярод бяскрайніх лясоў, балот і пясчанікаў, сумесна іх асвойвалі [6].

Вошкаўцы. У гады савецкай улады немілагучная назва *Вошкаўцы* была заменена на ганарлівую – *Ураджайная*. Сярод мясцовых жыхароў існуюць розныя версіі паходжання назвы

вёскі: “Вашкаўцы – гэта таму, што тутака Івашка жыў. Мне мой дзед разказваў, што ў гэтага Івашкі дванаццаць сыноў было. І ўсе Вашкаўцы: Пятро Вашкавец, Стась Вашкавец...”, “Вошкаўцы? Відаць, тутэйшыя жыхары, якія былі да нас, вельмі многа вошкаліся. Вошкаліся... ну, марудзіліся, поркаліся доўга, карацей, дарма марнавалі час” [22].

Выганаўскае. *(гідр.)* Назва возера, якое раскінулася на мяжы Ляхавіцкага і Івацэвіцкага раёнаў, ідзе ад беларускага слова “*выган*” – месца, дзе раней сяляне пасвілі жывёлу [14, 18].

Выемка. *(мікр.)* Месца на ўзлеску пры чыгуначным пуці, на поўдзень ад вёскі Русінавічы. Утварылася ад слова *вымаць*. У Выемцы бралі пясок, жвір на будаўніцтва чыгункі, дарог.

Выжар. *(мікр.)* У Задвор’і – балота, на якім сушылі сена, яно было топкае.

Вялікая Лотва. Лотва – гэтак называюць забалочаную нізіну, вельмі вільготную ад разліваў ракі. На ёй звычайна растуць гарлачыкі белага ці жоўтага колеру – *лотаці*, *лотвы*. Адсюль, менавіта, і пайшла назва вёскі, якую пабудавалі каля такой балацявіны. Старэйшыя жыхары расказваюць пра існаванне непадалёку ад іх вёскі перавозу праз раку. На беразе стаялі вялікія лодкі, на якіх перавозілі жывёлу. Менавіта тое месца і звалі Вялікай Лотвай. У кнізе беларускага гісторыка Міколы Ермаловіча “Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае” гаворыцца, што, магчыма, назва *Лотва* паходзіць ад імя балцкага племені – лотва. Аўтар лічыць, што менавіта адсюль, з зямель, на якіх стаяць сучасныя вёскі Вялікая і Малая Лотва, пачалося рассяленне плямён літвы і лотвы на паўночны захад, поўнач і паўночны ўсход [4].

Вясёлая. *(мікр.)* Так называецца аўтобусны прыпынак за тры кіламетры ад вёскі Русінавічы. Назва прыйшла з далёкіх часоў, калі на месцы цяперашняга Дарагушскага лесу знаходзіўся

фальварак ляхавіцкіх васалаў. Яны былі і ўладальнікамі карчмы, што стаяла непадалёку ад дарогі. Гэта было, як кажуць, бойкае месца, бо дарога звязвала шмат вёсак з Ляхавічамі. Таму карчма звычайна не пуставала. Тут можна было не толькі падсілкавацца і адпачыць з дарогі, але пачуць розныя навіны, цікавыя гісторыі, жарты. Весела бавіўся час у карчме. Таму і само месца, дзе яна стаяла, людзі пачалі называць вясёлым [7].

Г

Гаёўка. *(мікр.)* Урочышча каля вёскі Русінавічы. У Гаёўцы стаялі дзве сядзібы. Сядзібы належылі леснікам, якіх за польскім часам называлі *гаёвыя*.

Гайдушка. *(мікр.)* Багністая мясціна каля вёскі Свяціца, якая не высыхала нават у летнюю спёку, гайдалася [26].

Гайкі. *(мікр.)* У Крывошыне – мястэчка на месцы цяперашняй псіхіятрычнай бальніцы; раней тут быў лес, вельмі прыгожы, па словах жыхароў: дубовы, бярозавы.

Гайнін/Гайнінец. 1) Найбольш верагоднай асновай паходжання назваў з'яўляецца слова "*гай*" у значэнні "невялікі лісцёвы лес". Дадзены тэрмін можна супаставіць з прырэчнымі лясамі. Меньш верагодна супастаўленне з дзеясловам "*гаіць*" – "абараняць, закрываць". Існуе таксама версія балтыйскага паходжання гэтых назваў: яно магчыма, калі за зыходную форму ўзяць літоўскае слова "*айна*". Тады назву можна супаставіць з літоўскім "*ainis*" – "унук", "*ainija*" – "патомства". Тады можна выказаць здагадку, што славянская форма *Гайна* была прынята і пераасэнсавана ў літоўскім на "*айна*". Пры такой асіміляцыі звычайна знікае пачатковая літара *г* [18].

2) Паходзяць ад прозвішча *Гайнін*. Дадзенае прозвішча ў адной трэці выпадкаў мае рускае паходжанне, таксама існуе невялікая верагоднасць, што прозвішча беларускага ці ўкраінскага паходжання, прыкладна ў чвэрці выпадкаў яно прыйшло з моў бурацкага, мардоўскага, татарскага, казахскага народаў. Таксама магчыма ў 20% мае яўрэйскія карані, у 20% з'яўляюцца русіфікаванымі варыянтамі латышскіх прозвішчаў. Хутчэй за ўсё гэта прозвішча паходзіць ад мянушкі, імя, або прафесіі далёкага продка яе носьбіта, да таго ж у большасці выпадкаў па мужчынскай лініі. Хоць нярэдкія выпадкі, калі прозвішча *Гайнін* перадавалася і па жаночай лініі.

Гактары. *(мікр.)* Зямля з левага боку рэчкі Ведзьмы ў вёсцы Сваятычы, якая раней належала графу Зібер-Плятэру.

Галаўнінцы. 1) Па расказах старажылаў на месцы вёскі некалі стаяў велізарны лес. Жыхары выпальвалі яго і апрацоўвалі невялічкія зямельныя надзелы. Існуе паданне, што ў той час жыў у гэтых мясцінах вельмі жорсткі пан. Нават за малую правіннасць караў ён сваіх прыгонных смерцю. Доўга цярпелі яго здзекі сяляне, а калі жыццё стала зусім нязносным, распачалі паўстанне. Кіравала паўстаннем дзяўчына з народу. Звалі яе Ніна. Паўстанцаў пачалі называць *"нінцамі"*, утварыўшы гэтую мянушку ад імя той дзяўчыны. Паўстанне ў хуткім часе было падаўлена. Панскія стражнікі ўсім *"нінцам"*, трапіўшым у іх рукі, і самой Ніне адсеклі галовы. Адсечаныя галовы пакідалі ў раку. Магчыма, у памяць пра гэта і далі вёсцы назву Галаўнінцы [4].

2) Назва, утвораная ад прозвішчаў *Галаўня*, *Галаўнін*, *Галовень* [18].

Ганцавічы. 1) Асновай для назвы паслужыла мужчынскае ўласнае асабовае імя *Ганка (Ганька)* або *Ганко (Ганько)* – вытворныя ад *Ган(ь)*. Працэс утварэння суправаджаўся

чаргаваннем зычных *к* – *ц*. Фармант[3] *-авічы* ўказвае на тое, што паселішча заснавалі нашчадкі *Ганкі* або *Ганькі* [6].

2) Магчыма, у аснову назвы вёскі лягло прозвішча *Ганцэвіч* ці *Ганцавіч* [4, 18].

Ганчары. 1) Назва знаходзіцца ў сувязі з ганчарным рамяством, якое шырока практыкавалася ў розных раёнах Беларусі. *Ганчар* – гэта майстар па вырабу глінянага посуду, а ў старажытную пару вядомы таксама як “пячнік”, “чарапічнік”. Занятак, прафесія складалі важную, асабліва адметную рысу чалавека, якая нярэдка пераўвасаблялася ў яго імя-мянушку або прозвішча. Множналікавы фармант абазначае, што паселішча заснавана на калектыўных пачатках [6, 18].

2) Старэйшыя жыхары Ганчароў расказваюць, што чулі яшчэ ад сваіх дзядоў паданне пра паходжанне назвы сваёй вёскі. На месцы, дзе зараз знаходзіцца вёска, раней быццам бы быў маёнтак пана Корчыца. Аднойчы завітаў да яго ў госці пан па прозвішчу Ганчар. Бавячы час, селі яны за картачны стол. І здарылася так, што прайграў пан Ганчар пану Корчыцу двух сваіх лепшых парабкаў. Аднаго звалі Зіневіч, а другога Малевіч. Мясцовыя жыхары клікалі іх “ганчарамі”. Верагодна, гэта мянушка і стала назваю вёскі [4].

Гара. *(мікр.)* Месца на мяжы Зубелевіцкай і Канюхоўскай зямель. Таксама носіць назву *Акопы* – пасля Першай сусветнай вайны там засталіся акопы, якія былі зруйнаваныя толькі пасля стварэння калгасаў.

Гараватыя. *(мікр.)* Урочышча каля вёскі Востраў. Мясцовыя жыхары лічаць, што назву яно палучыла таму, што зямля там была пясчаная, збожжа расло кепска і людзі жылі бедна, гаравалі.

[3] Фармант – інфармацыйная частака тапоніма, словаўтваральная марфема; тое ж, што і афікс.

Гарадзішча. 1) *Гарадзішча* – рэшткі старажытнага ўмацаванага паселішча. Іх з'яўленне – вынік недаўгавечнасці невялікіх старажытных гарадкоў, разбураных войнамі і заняпалых па розных іншых прычынах. На месцах гарадзішчаў або па суседству з імі звычайна ўзнікалі сельскія паселішчы з аднайменнымі назвамі. Першыя ўпамінанні пра іх ў асноўным адносяцца да XVI стагоддзя, калі распачаўся строгі ўлік абшчынных і прыватных зямельных уладанняў [6].

2) Гарадскі пасёлак Брэсцкай вобласці і некалькі вёсак такой жа назвы ў розных частках Беларусі. Першапачатковы сэнс назвы – паселішча на месцы нейкай гарадзьбы, горада. Такія назвы часта сведчаць аб даўніх дагістарычных паселішчах і таму вельмі важныя для археалагічных даследаванняў [16, 18].

Гаслаўскі лес. *(мікр.)* Лясны масіў, пачынаецца адразу за вёскай Гаслаўшчына, адсюль і назва.

Гаслаўшчына. Утварылася на месцы маёнтка Скубятоўшчына, пажалаванага ў 1567 годзе Жыгімонтам Аўгустам свайму ляхавіцкаму васалу *Гаслаўскаму*. Адсюль і назва вёскі [4].

Гасцілавічы. 1) *Гасцілавічы* – нашчадкі чалавека па імені *Гасціла*. У тапанімію яно магло трапіць праз стадыю прозвішчаў *Гасціла, Гасціловіч* [6].

2) Назва патранімічная, якая мае аснову *гасціць*, *гасціль*. *Гасціла* – мастаўшчык, укладальнік камянёў, бярвенняў на дарозе, гаці [18].

Гарбачы. Назва, вытворная ад мянушак і прозвішчаў [18].

Глінішча. *(мікр.)* Тэрыторыя каля паселішчаў, дзе жыхары капалі гліну. Распаўсюджаны мікратапонім.

Гнідаўшчына. *(мікр.)* Лес каля вёскі Пад'язаўле. Дрэвы раслі вельмі блізка адно ад аднаго, лес быў вельмі сыры і цёмны, ад таго і пайшла назва.

Горка. *(мікр.)* Поле ці паляна на месцах былых хутароў. Назва адлюстроўвае характар рэльефу навакольнай мясцовасці. Сустракаецца амаль у кожным населенным пункце.

Горкава. *(мікр.)* Сенажаць каля вёскі Крывошын, дзе расла вельмі горкая трава. Людзі казалі: “пайшоў пад Горкага”.

Графская будка. *(мікр.)* У свяціцкіх лясах быў пабудаваны так званы “кардон” для графа Патоцкага, які да 1939 года прыязджаў у гэтыя мясціны на паляванне. Пасля палявання Патоцкі адпачываў у сваім “кардоне”. З тых часоў мясціна завецца Графскай будкай [26].

Грушаўка. 1) Цікава, што ў некаторых крыніцах назва вёскі пішацца як *Грошаўка*, ці па-польску *Grozhowka*. Існуе нават паданне аб тым, што вёска, якая належала ў свой час панам Рэйтанам, дасталася ім задарма, за грош. Некаторыя ж жыхары вёскі сцвярджалі, што яе ўладальнікі мелі вельмі вялікі даход з гэтага маёнтка. Адсюль і назва вёскі ў свой час магла гучаць як *Грошаўка* [4].

2) Назва ўтворана ад асновы “*груша*” – дрэва [18].

Грэбля. *(мікр.)* Невялікае поле за вёскай, непрыдатнае для земляробства, дзе касілі і “*грэблі*” сена. Шырока распаўсюджаная назва.

Гукова. У аснове назвы імя-мянушка *Гук*. Фармант *-ова* абазначае індывідуальную прыналежнасць [6, 18].

Гулічы. 1) Ёсць падставы сцвярджаць, што назва вёскі *Гулічы* паходзіць ад прозвішча *Гуліч*. Яно ўпамінаецца ў адной з пісьмовых крыніц XVI стагоддзя, дзе ўказваецца, што Б. Гуліч як дробны феадал павінен быў выставіць са свайго маёнтка аднаго коннага воіна ў войска вялікага князя. Пэўна, тут пражывалі і іншыя прадстаўнікі гэтага роду. Зараз у вёсцы людзей з такім прозвішчам няма. Само прозвішча *Гуліч*, верагодней за ўсё, утворана ад слова *“гуляць”*. Такімі мянушкамі

ў народзе называлі тых, хто не любіў працаваць, а толькі бавіў час. Але ёсць і другое значэнне гэтага слова. *Гуляць* – у разуменні прыгожа танцаваць. Дарэчы, у тых мясцінах, дзе размешчана вёска Гулічы, людзі пасяліліся вельмі даўно. Бо навокал яе многа курганоў-намагільнікаў, якія былі насыпаны дрыгавічамі ў X–XIII стагоддзях [3].

2) Паходзіць ад імя шляхціча Б. Гуліча, уладальніка маёнтка (1567 г.) [13].

3) “Ну я ж з Гулічэй. Гулічы наша сяло. <…> Быў кругом лес бальшы ў нас. І не тое што тамака адно лес, але і ваўкі вылі. Калі выйдзем мы з хатаў, то і баяліся. “Гу-улічы, гу-улічы,” – вылі ваўкі гэтак. Очэнь многа. І лес вялікі кругом быў: і бярэзнікі, хвойнік кругом. <…> Гу-у-у. І вот гэты гук вот яно гэдак і было. Ад гулу ваўкоў” (Запісана у 2003 годзе ад Марыі Іванаўны Цюцін, 1928 г.н., вёска Гулічы, Ляхавіцкі раён) [15].

4) У аснове назвы словы *гуль, гула* – буйная бародаўка, нараст (параўн. выразы: “у яго на шыі гула вырасла” ці “гулу смаленую табе”, ці “гузак як гула вялікая на патыліцы”, ці “з гулькін нос” і г. д.). Ад іх шэраг мянушак і прозвішчаў: *Гуло, Гулько, Гуль, Гуліч*, таксама літоўская *Гуліс* [18].

Гута. 1) *Гутамі* ў XVII–XIX стагоддзях называлі шкляныя і металургічныя прадпрыемствы на тэрыторыі Беларусі. Гэты тэрмін існуе ў польскай, чэшскай, славацкай мовах. Паселішчы з падобнаю назваю ўзнікалі на месцы такога прадпрыемства ці засноўваліся перасяленцамі, якія працавалі на іх [4].

2) Паводле расказаў мясцовых жыхароў, вёска атрымала сваю назву ад першапасяленца па прозвішчу *Гутніцкі*.

3) Верагодна паходжанне ад нямецкага *hutte* – хаціна [18].

Гэбр. *(мікр.)* У Тальмінавічах – лес, куды ходяць па чарніцы і суніцы, грыбы.

Д

Дабрынь. *(мікр.)* Урочышча каля вёскі Тухавічы, прыбярэжная левастаронняя паласа ракі Шчары. Назва – станоўчая характарыстыка мясцовасці: добры ўчастак зямлі, добрая сенажаць.

Дамашы. 1) Назва суадносіцца з уласным асабовым імём *Дамаш* – варыянт царкоўнага імя *Даміян*. У беларусаў ад гэтага імя ўтворана шмат прозвішчаў: *Дамаш, Дамашоў, Дамашэвіч, Дамашык, Домаш, Домась* і інш. Імя магло стаць асновай для тапоніма праз утвораныя на яго аснове прозвішчы *Дамаш, Домаш*. Множналікавы фармант азначае, што паселішча заснавана на калектыўных пачатках [6, 18].

2) Спачатку слова “*домаш*” было мянушкай, якое затым перарасло ў прозвішча і назву вёскі. І сёння людзей з такім прозвішчам у наваколлі шмат. *Домаш* – значыць такі чалавек, які не прывык у вольны час хадзіць да суседзяў і знаёмых, а часцей за ўсё знаходзіўся дома. У. А. Юрэвіч у кнізе “Слова жывое, роднае, гаваркое...” *дамашамі* называе тых жанчын, якія ў гарачую пару сенакосу ці жніва заставаліся даглядаць малых дзяцей, а таксама тых гаспадароў, што не бегаюць па чужых хатах, а заняты сваімі гаспадарчымі справамі. Вёску, ў якой жывуць такія людзі, назвалі Дамашамі [3].

Дарава. 1) Мясцовыя жыхары лічаць, што назва паходзіць ад прозвішча паноў *Дароўскіх*, якія валодалі гэтым маёнткам ў XVII стагоддзі [4].

2) У 1498 годзе – панскі двор, пазней маёнтак шляхцічаў Л. С. і Б. Л. Дараўскіх [13].

3) У тапанініі – назвы-азначэнні: падараваная зямля (дар), бясплатная [18].

Дарагуш(ж)скі лес. *(мікр.)* Кавалак лесу непадалёку ад вёсак Мыслабаж і Русінавічы. Названы ад прозвішча ці мянушкі чалавека *Дарагуш(ж)*, сядзіба якога стаяла ў гэтым лесе.

Двор. *(мікр.) Двор* – агульнаславянскае слова, якое ўжо ў X стагоддзі было вядома ў значэнні "жыллё, сядзіба, дом", у X–XII стагоддзях – як "уладанне князя з маёмасцю і чэлядзю (княжы двор)", у наступныя перыяды – пераважна як жыллёвых і гаспадарчых пабудоў з зямельнымі ўгоддзямі; сядзіба [6]. Распаўсюджаны мікратапонім.

Дзіковіна. *(мікр.)* У Навасёлках – забалочанае, дзікае месца, паросшае асакою. У паўночным накірунку ад вёскі Навасёлкі – Малая дзіковіна, поле паміж вёскай Навасёлкі і Куліком – Вялікая дзіковіна.

Дзірван. Паселішча на даўно нявораным полі, верхні слой глебы якога густа парос травой і ператварыўся ў дзёран, цаліну [6, 18]. Сустракаецца паўсюдна.

Дзягцярка. *(мікр.)* Балоцістае, неўрадлівае месца каля вёскі Мыслабаж. У пасляваенны час частка гэтага месца трапіла пад забудову новай вуліцы (цяпер – Новая вуліца ў вёсцы). У наш час Дзягцяркай называюць месца ў канцы зямельных участкаў Новай вуліцы, дзе ўвесну, увосень і занадта дажджлівае лета мокра, гразка, стаіць вада, а таму вымакае, гіне ўраджай.

Дрэкі. Паводле расказаў мясцовых жыхароў, першапасяленцам тут быў Вайтус. І да гэтага часу жыхары вёскі Дрэкі завуць яе Вайтукі. А вось чаго вёска мае назву Дрэкі, ніхто з мясцовых жыхароў не памятае.

Дрэнніца. *(мікр.)* Так у вёсцы Жарабковічы называлі поле, якое было беднае на ўрадлівы слой зямлі – гумус, і таму давала дрэнны ўраджай.

Дубіна. *(мікр.)* 1) *Дубіна* – пераагучанае польскае слова *debina* – "дубовы лес". Ужываецца ў якасці ўласных назваў іншых

геаграфічных аб’ектаў; *дубіна* – зараснік дубоў [6]. Сустракаюцца іншыя варыяцыі назвы: *дубавец*, *дубкі* і г.д.

2) У Навасёлках – ад слова “*дубар*” – холад; месца, дзе па вясне ўсё вымярзала, размешчана ўздоўж дарогі ад вёскі Пранчакі да вёскі Каранеўшчына.

Ж

Жарабковічы. 1) Назва ўтворана ад асновы “*жарабец*” у патранімічным аздабленні [18].

2) Існуе паданне, што некалі ў тых мясцінах жыў пан і надта ж ён коней любіў, што хочаш за іх аддаць мог. Аднойчы прачуў, што ў далёкага пана ёсць жарабец, ды такі прыгожы, крэпкі, якіх мо свет яшчэ дагэтуль не бачыў. Паехаў ён да тога пана і ўпрасіў прадаць каня. З таго дня памешчык нічым іншым, акрамя гэтага жарабца, не цікавіўся. Запусціў сваю зямлю, закінуў вялікую гаспадарку, толькі сядзеў штодзень ды з канём, нібы з чалавекам, размаўляў. Неяк летнім часам з’явіўся ў гэтых мясцінах цыганскі табар, а яны ж, вядома, болей за ўсё на свеце коней любілі. Убачыў адзін малады цыган жарабца і прыкіпеў: “Звяду, толькі маім конь будзе!”. Сапраўды, ціхай раніцай у пакоі ўляцеў спалоханы конюх і паведаміў пану, што жарабца ўкралі. Кінуліся наўздагон. Адчуў злодзей, што не ўцячы яму ад пагоні, але жарабца шкада кідаць. Тады ён чыркнуў бедную жывёліну вострым нажом па шыі і ўцёк у лес. Калі пана да канаючага каня прывезлі, то ён плакаў над ім усё роўна, як над чалавекам. Закапалі жарабца на тым самым месцы, дзе ён крывёю сцёк, а гаспадар загадаў над ім высокі дубовы крыж паставіць. Ад гэтае падзеі і вёску назвалі Жарабковічамі. А крыж той яшчэ на пачатку XX стагоддзя стаяў. Вёска ж, дзе пражываў пан і дзе заходзілася

яго стайня, атрымала назву *Канюхі*. Гэтае суседняе сяло ў дзве вярсты ад *Жарабковічаў* [3, 18].

Жардэлі. *(мікр.)* Участак поля на рагу чыгуначнага пуці і старой Брэст-Маскоўскай шашы на поўдзень ад вёскі Русінавічы.

Жарскія. Назва, вытворная ад прозвішча *Жарскі* [18].

Жвіроўня. *(мікр.)* Урочышча каля паселішчаў, дзе людзі збіралі жвір. Распаўсюджаны мікратапонім. У вёсцы Востраў мае і другую назву – *Капельня* (верагодна, ад слова "*капаць*").

З

Забер'е. Назва ад прозвішча чалавека-пасяленца або ад таго, што знаходзілася (у мінулым) за бярэзнікам.

Завінне. Назва ўтворана ад тэрміна "*вынья*" – вялікая паляна сярод лесу [18].

Загароддзе. *(мікр)* У Зубелевічах – ворыўны масіў на паўднёвы ўсход, адразу за вясковымі агародамі. Таксама назва сустракаецца ў вёсцы Галаўнінцы.

Задвор'е. Назва-тэрмін: "*задворнікі, задворцы*" – пасяленцы, якія выйшлі з вялікай сям'і, двара, агульнай гаспадаркі [18].

Зазер'е. *(мікр.)* Мясціна на паўднёвым усходзе ад вёскі Тухавічы, названа па прозвішчы лесніка *Зазерскага*, які там жыў.

Зайчыкава горка. *(мікр.)* Узгорак у полі каля рэчкі Свідроўка на мяжы вёсак Русінавічы і Гаслаўшчына. Поле належала двум братам Казіміру і Іосіфу Юнікам, якія мелі мянушку *Зайчыкі* за тое, што маглі злавіць рукамі соннага зайца.

Заклетка. *(мікр.)* Мясцовасць ў некалькіх метрах ад вёскі Галаўнінцы, у бок сучаснага лагера "Чайка". Калісьці тут нарыхтоўвалі сена.

Заліпенне. 1) Аналагічна назве *Ліпск*, якая пайшла ад слова “*ліпа*” [13].

2) Назва-арыенцір: паселішча за ліпамі [18].

Залужжа. 1) Назва-арыенцір: *Залужжа* – вёска, пабудаваная за лугам. Такім жа чынам утвараліся назвы вёсак: *Заполле, Забер’е, Заліпенне, Зарэчча, Залаззе*. Па аналогіі пры дапамозе прыназоўніка “*пад*” утвараліся назвы вёсак: *Падлессе, Падбарочча, Пад’язаўле, Падсаколле* [4].

2) Са старажытнага падання, якое пераходзіла з пакалення ў пакаленне, вядома, што там, дзе сёння стаіць вёска Залужжа, некалі быў вялікі луг, за якім прытуліліся некалькі хацін. Пры сустрэчы чалавек пытаў у другога: “Куды ты ідзеш?”, а той адказваў: “За луг”. Так і назва ўтварылася [25].

Занавоззе. *(мікр.)* Поле, вялікі надзел зямлі за вёскай Мыслабаж.

Зарытава[4]. 1) Па паданню жылі-былі доўгі час людзі ў гэтым пасяленні і не думалі нават даваць свайму месцу пражывання якую-небудзь назву. Яна, назва, прыстала пазней сама. А было гэта так. Любілі мясцовыя жыхары добра папрацаваць, а потым смачна і сытна паесці. Асабліва падабалі свініну, таму і разводзілі шмат свіней. Зімой так-сяк ператрымаюць у будане, а з ранняй вясны да позняй восені пасвілі іх вакол пасялення. Ну а свінні ёсць свінні. Усё рыюцца ў зямлі, вакол сялення ўсё “перааралі”. Нават адзіную дарогу, што вяла сюды, спаганілі. Цяжка прыходзілася дабірацца і сваім, і чужым: ці то конна, ці то пешшу.

[4] *Гістарычная даведка.* Сучаснае месцазнаходжанне вёскі Зарытава не адпавядае першапачатковаму. Новае паселішча было адбудавана пасля Вялікай Айчыннай вайны. А тое, ранейшае, знаходзілася на поўнач ад гэтага, кіламетры за тры па дарозе на Мацылёўшчыну, адразу за ручаём меліярацыйнага канала. Ад яго засталіся толькі старыя зарытаўскія магільнікі [3].

Чалавек, што вяртаўся адсюль, сустракаючы на сваім шляху незнаёмца, які накіроўваўся ў пасяленне, папярэджваў яго, паказваючы рукой на калена: “Там зарыта – во!”. Так гэтыя словы перасцярогі “зарыта – во!” і сталі з цягам часу назвай вёскі.

2) Паводле другога падання, у даўнія часіны бойкі, набегі, напады былі самай звычайнай справай. Нават брат ішоў на брата, сын – на бацьку, не кажучы ўжо пра суседзяў і чужынцаў. Штурхала на гэта часта прага завалодаць багаццем іншых. Здарылася такое і ў нашых мясцінах. Аднойчы падчас такой бойкі адзін з набежчыкаў у спешцы прыхаваў мех са скарбам пад дрэвам, выкапаўшы неглыбокую яміну, якую затым засыпаў зямлёй і леташнім лісцем. На большае не хапала часу – па следу ішла пагоня. Па зарыты мяшок вярнуўся пазней. Але пазнаць дрэва, пад якім схаваў скарб, ужо не змог. Толькі і раставацца з думкай аб ім не хацелася. Таму ён рашыў перабрацца сюды са сваімі родзічамі і абшчыннікамі жыць – мо з цягам часу ўсё ж такі знойдзецца схованае. Старога мужчыну часцяком можна было ўбачыць у ляску. Ён штосьці шукаў пад дрэвамі, капаючы рыдлёўкай зямлю. Калі хто з пасяленцаў асмельваўся спытаць у яго, што ён шукае тут, са шкадаваннем гаварыў: “Тут скарб зарыты”. Часам і другія ўпотай падключаліся да пошуку. Амаль увесь лясок перарылі. Знайшлі яго ці не – невядома. А вось назва Зарытава за вёскай замацавалася [3].

Засаддзе. *(мікр.)* У Зубелевічах – ворыўны масіў на поўнач ад вёскі.

Засценкі. *(мікр.)* Лясок, які аддзяляў вёску Задвор’е ад вёскі Пад’язаўле.

Змяіная горка. *(мікр.)* Вельмі высокае, крутое месца каля вёскі Русінавічы. У гэтым месцы рэзкі перапад вышынь. На гэтай горцы збіраецца шмат змеяў, гадаў, адсюль і назва.

Зубелевічы. У адным з мясцовых паданняў гаворыцца, што ў незапамятныя часы на ўскраіне вёскі знаходзілася прыгожае мястэчка пад назвай Серкаўшчына. На яго тэрыторыі раскінулася цудоўнае ўрочышча з возерам. Тут жа ўзвышаўся і панскі дом. У гэтым мястэчку пражываў адзін з работнікаў пана, прозвішча якога было *Зубель*. Мяркуюць, што менавіта яно і дало назву пазней вёсцы, якую пачалі называць Зубелевічы. У другім паданні значыцца, што спачатку Серкаўшчына была ўласнасцю магнатаў Радзівілаў. Пазней яна была прададзена пану *Зубелевічу*. Ад гэтага прозвішча пайшла назва Зубелевічаў.

Зэеў бярэзнік. *(мікр.)* Зямельны надзел каля вёскі Крывошын. Ён належаў чалавеку, якога звалі *Зэй*.

Зялёная горка. *(мікр.)* Узвышша з пладароднай глебай у паўночна-ўсходнім накірунку ад вёскі Навасёлкі, якое ў даўнія часы было засеяна травой і выкарыстоўвалася як паша для выгану ската.

К

Кавалі. Назва паходзіць непасрэдна ад назвы прафесіі. У канцы XIX стагоддзя ў вёсцы сапраўды існавала некалькі кузняў. Таксама верагодна паходжанне назвы пайшлі ад прозвішча *Каваль, Кавалёў, Кавалевіч* [18].

Казакоў брод. *(мікр.)* Балоцістае месца каля вёскі Крывошын, праз якое ў 1861 годзе казакі зрабілі брод пры паўстанні пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага.

Казюкова горка. *(мікр.)* У Навасёлках – мясціна, дзе калісьці стаяў хутар, а зямля вакол яго прыналежала мясцоваму гаспадару – *Казіку*.

Каласоўка. *(мікр.)* Так у вёсцы Сваятычы называлі поле, дзе добра радзіла жыта, былі ўмалотныя каласы.

Камяніста. *(мікр.)* Месца былога хутара каля вёскі Канюхі, вызначаецца вялікай колькасцю камянёў.

Камянка. *(мікр.)* Урочышча на поўнач ад вёскі Мыслабаж за Зарэччам і на другі бок чыгункі аж да Грушаўскага лесу, куды ганялі на выпас кароў з вёсак Мыслабаж і Русінавічы. У наш час Камянка ўяўляе сабой вялікі масіў лесу.

Канцырог. *(мікр.)* Кусок поля, выган на паўднёвы ўсход ад вёскі Русінавічы, дзе рэчка Свідроўка робіць заварот на захад у канцы вёскі. Назва ўтварылася ад месцазнаходжання поля на канцы рога, на вуглу, на рагу вёскі, рэчкі.

Канюхі. У мінулым – гэта невялікія пасёлкі пры гаспадарскіх дварах, фальварках, маёнтках, у якіх жылі толькі канюхі. Яны даглядалі коней, рыхтавалі іх для выезду на панскае паляванне, выконвалі розныя працы, звязаныя з конскай цяглавай сілай. Асноўная большасць такіх паселішчаў прыпадае на XVI–XVII стагоддзі [6]. Таксама назва звязана паданнем з вёскай Жарабковічы.

Капелька. *(мікр.)* Штучны вадаём, размешчаны паміж вёскай Галаўнінцы і мясцовай конефермай. Назву атрымаў ад формы, якая нагадвае каплю вады.

Каранеўшчына. Назва утворана ад прозвішча *Корань* [18].

Карпавячызна. *(мікр.)* Такую назву носіць поле ў вёсцы Востраў, якое некалі належала заможнай сям'і з прозвішчам *Карповіч*. У гады раскулачвання сям'я эмігравала ў Польшчу, а поле і дагэтуль носіць іх прозвішча.

Карчы. *(мікр.)* Невялічкі лясны масіў на захад ад вёскі Навасёлкі, які час ад часу высякаўся на дровы мясцовымі жыхарамі, пасля чаго засталіся старыя пні і карчы.

Карэціна. *(мікр.)* Поле на поўнач ад вёскі Мыслабаж. Ад назвы гразкага месца на дарозе, дзе вязлі карэты паноў Касакоўскіх.

Карэя. *(мікр.)* Урочышча на захад ад вёскі Русінавічы.

Клін. *(мікр.)* Старэйшыя жыхары расказваюць, што быў час, калі ў вёсцы пачалося моравае паветрые – халера. Не было ад яе ніякага паратунку. Чым толькі ні спрабавалі людзі ратавацца ад той хваробы. Калі ўсе сродкі былі выкарыстаны, вырашылі паспрабаваць апошні: закапалі на могілках хлопчыка, пеўня і ката. Певень і кот былі чорныя, а хлопчык меў чорныя валасы. Быццам бы з таго часу халера пачала сціхаць. А месца, дзе закапалі вяскоўцы сваю ахвяру, з тых пор завецца *Клін* [4].

Княжное. *(мікр.)* У Тальмінавічах – поплаў на мяжы Брэсцкай і Мінскай абласцей.

Конькі. Аб узнікненні назвы вёскі існуе легенда. За вёскай, на месцы, дзе зараз знаходзіцца штучнае возера, знаходзіўся маёнтак пана Кабылінскага. У той час толькі ў яго меліся коні, на якіх ён раз'язджаў. А паколькі ён жыў непадалёку ад гэтага населенага пункта, вёску і назвалі Конькі.

Корчыцаў лес. *(мікр.)* Лясны масіў паміж вёскамі Русінавічы і Ганчары. Назва ўтворана ад прозвішча чалавека *Корчыц*, які жыў у гэтым лесе.

Краглі. Назва балтыйскага паходжання [18].

Крамніца. *(мікр.)* Вялікая і малая крамніцы – месцы ўздоўж канавы ў пойме ракі Ліпнянка. Раней гэта былі самыя лепшыя ўчасткі для сенажаці.

Крапіўка. *(гідр.)* Рака ў вёсцы Падлессе. Згодна паданню, ў ёй утапілася дзіця чараўніцы. Жанчына закрыла раку патэльнай, і тая высахла [23].

Кругліца. *(мікр.)* Мясціна ў вёсцы Жарабковічы, якая раней была пад балотцам і нагадвала форму круга. Зараз там утварылася невялікае азярцо.

Крыване. *(мікр.)* У Свяціцы – астравок на дрыгве вакол Селішча [26].

Крывое Сяло. *Сяло* – тып паселішча ў адрозненне ад горада. Значэнне слова змянялася: сялом называлі буйное сельскае паселішча ў адрозненне ад невялікага (вёскі). Тапонім *сяло* (часта з азначэннямі) ёсць у кожнай вобласці Беларусі. Асабліва іх шмат у Віцебскай вобласці. Таксама магчыма ўказанне на знешні выгляд паселішча, дзе вуліцы былі няроўнымі, або дамы былі пабудаваны не ў адну лінію.

Крывошын. 1) Паводле аповядаў вяскоўцаў існуюць некалькі паданняў пра паходжанне назвы вёскі Крывошын. Адно сцвярджае, што некалі на месцы Крывошына стаяла хатка гаёвага, які меў крывую шыю. Другое звязвае назву з адметнасцю дарогі, каля якой узнік Крывошын. Нібыта дарога мела частыя выгіны, і ў едучых па ёй падарожных пачынала ад тых паваротаў у галаве круціцца, быццам ад выпітай чаркі. Таму і празвалі тую дарогу “*крывы шынок*” [4].

2) Назва, вытворная ад прозвішчаў *Крывы, Крывошын* [18].

Крышыннік. *(мікр.)* У Зубелевічах – ворыўны масіў на поўнач ад вёскі.

Кулік. *(мікр.)* Невялічкая частка сучаснай вёскі Навасёлкі, размешчаная ў паўночным накірунку. *Кулічкі* альбо *кулік* – самы дальні вугалок вёскі, куточак.

Кулікі. Назва ўтворана ад прозвішчаў *Кулік, Кулікоў* [18].

Куль. *(мікр.)* Невялікі надзел зямлі, клін поля на рагу Гаслаўскага лесу, дзе жыў дзед па мянушцы Качалка. Ён качаў з жыта кулі саломы і вазіў прадаваць на кірмаш. Гэтай кулявой саломай людзі крылі стрэхі хат, хлявоў.

Кульбакаўшчына. *(мікр.)* Сенажаць у пойме ракі Шчара на паўднёвы захад ад вёскі Мыслабаж. Магчыма, назва сенакосу ёсць вытворнае ад слоў “*кульба*” ці “*кульбака*” – палка з загнутым верхнім канцом для апоры пры хадзьбе.

Куршынавічы. 1) Паводле мясцовага падання, з даўніх часоў у гэтых мясцінах ніхто з людзей не жыў. Дзікі куток заставаўся ўбаку ад паселішчаў. Абыходзілі яго бокам. Тады ўвесь наш край быў пакрыты густымі спрадвечнымі барамі і пушчамі. Гэтых лясоў ніхто ніколі не сек. Але ж неяк і сюды людзі завіталі. Спачатку ўсяго чалавекі два-тры прыйшло. Хадзілі, нешта высочвалі, прыглядаліся да наваколля. Дзён праз колькі вярнуліся з сем’ямі. Жывёлу сваю прывялі. Праз некаторы час застукалі сякеры, пацягнула дымам ад вогнішчаў, прышэльцы пачалі будавацца. Дружна ўзяліся лес карчаваць. Валяць дрэвы ды глядзяць, што нейкія яны своеасаблівыя. Карані метраў мо на пяць у глыбіню ідуць. Так, сілаю, не вырвеш і дакапацца не дакапаешся, бо вада з’яўляецца. Сталі раіцца паміж сабою найбольш вопытныя і прыйшлі да адзінай думкі – не трэба да канца вырываць, няхай сабе ў глыбіні і застаюцца. Яміны пяском-торфам пазасыпаць, а тое, што ў зямлі, для збажыны страшным не будзе. Ды пралічыліся людзі на гэты раз. Пасеялі збожжа на першы раз. Надышоў час жыта жаць. Пайшлі вяскоўцы, глядзяць, а на полі... карчоў-каранёў, ну нібы хто спецыяльна насеяў. Сабралі ўраджай – не густа. А жыць жа неяк трэба. Паспадзяваліся на наступны год. Старанна пазбіралі карчы, павыдзіралі нават самыя маленькія і на зіму зноў збожжа пасеялі. Прыходзяць у жніўні жаць. Глядзяць, а карчоў стала ўдвая болей. Памучыліся тыя людзі, пакуль сваё поле расчысцілі. А суседзі іхнюю вёску з-за гэтай нагоды *Карчынавічы* празвалі. Па-мясцоваму “*корч*” гучыць як “*курч*”, таму з цягам часу паселішча стала называцца Куршынавічамі [1].

2) Існуе ў вяскоўцаў паданне аб тым, што назва іх вёскі ўзнікла ад назвы распаўсюджанай у гэтай мясцовасці расліны – *крушыны*. Крушынавічы з цягам часу пачалі гучаць як Куршынавічы. Але ёсць і другая версія, а менавіта: вакол вёскі вялося шмат *коршунаў*. Адсюль узнікла назва Каршунавічы. Затым гучанне назвы змянілася на сучаснае – Куршынавічы [4].

3) Адна з легендаў апавядае, што вёска атрымала такую назву хутчэй за ўсё ад *куршаў*, якія жылі ў мінулым на крайнім захадзе сучаснай Літвы і Латвіі. *Куршы* (летапіснае *корсь*) – старажытнае балцкае племя, упершыню ўпамінаецца ў канцы IX стагоддзя. Існуюць дзве версіі з'яўлення іх на Ляхавіччыне. Першая: вайна з крыжакамі прымусіла многіх пакінуць свае наседжаныя месцы і ў пошуках лепшай долі адправіцца на суседнія землі. Перасяленні адбываліся на працягу XIII–XIV стагоддзяў. Паводле другой версіі, у канцы XIV стагоддзя падчас правядзення палітыкі ўмацавання каталіцызму на будаўніцтве касцёла ў вёсцы Мядзведзічы працавалі майстры з Беларусі, Літвы, Латвіі, Польшчы. Сярод іх былі і куршы. Пазней куршы, якія жылі ў Мядзведзічах, перасяляюцца на поўдзень ад іх і засноўваюць сваю вёску – Куршынавічы. Версія пацвярджаецца дакументальна пісцовай кнігай Пінскага і Клецкага княстваў [12].

Л

Лабузы. 1) *Лабузы* – група родзічаў па мянушцы або прозвішчы іх агульнага продка *Лабуз*, *Лабуза*, якія сумесна заснавалі паселішча. Найверагодней ад полькага слова *lobuz (лобуз)* – "гарэза, свавольнік, хуліган". Такую мянушку чалавек мог атрымаць і па асацыяцыі з пустазеллем. Пасееш – збожжа не расце, толькі лабуза [6, 18].

2) Па словах старажылаў, у даўнія часы вёска належала пану Ражскаму. Меў ён вялікую гаспадарку, у якой працавала шмат прыгонных. Пан быў вельмі сварлівы і за любую, нават дробную, правіну пачынаў сварыцца з працаваўшымі на яго вяскоўцамі. Падчас сваркі пан, звяртаючыся да сваіх прыгонных, называў іх *“лабусамі”*. *Лабус* – так і цяпер іншым разам завуць літоўцаў. Гэта мянушка ўтварылася ад літоўскага *“лабас діенас”*, што ў перакладзе азначае “добры дзень”. Магчыма, сярод падданых пана было многа балтаў, якія віталі адзін аднаго на роднай мове. Ад гэтай мянушкі, верагодна, і ўтварылася назва вёскі [4].

Лагі. *(мікр.)* У Зубелевічах – абшар каля параслага кустоўем лазы ручая. Лагі цягнуліся на поўнач і ўтыкаліся ў балоцістую мясцовасць.

Ламачына. *(мікр.)* Урочышча каля вёскі Востраў, непадалёку ад свінакомплекса “Белдан”.

Ламоўе. *(мікр.)* Месца на шляху з вёскі Мыслабаж у бок Гасцінца праз раку Міхалаўка. Нізкае, балоцістае месца, дзе білі крыніцы. Каб можна было пераехаць, клалі ламачча, масцілі дрэва, такім чынам рабілі пераправу, гаць. Ад таго і пайшла назва.

Лапацічы. Калі людзі пачалі сяліцца ў гэтай мясцовасці, яна была вельмі забалочанай. Старажылы вёскі расказваюць, што на кожным двары трэба было капаць канаўкі, па якіх сцякала вада. Жыхары павінны былі ўвесь час, ратуючыся ад вады і балота, з лапатамі ў руках займацца асушэннем сваіх зямель. Адсюль і пайшла назва вёскі Лапатычы, якая з цягам часу ператварылася ў Лапацічы [4].

Лашчыца. *(мікр.)* Ад слова *“лагчына”* – нізкае месца. Характэрна для вёскі Жарабковічы.

Ліпніцы. *(мікр.)* У вёсцы Галаўнінцы – поле, зямля на якім лічыцца самай урадлівай на працягу многіх гадоў. Назву атрымала ад таго, што даўно тут расло многа ліпаў і шаўкавіц.

Ліпнянка. *(гідр.)* Рака Ліпнянка праклала свой шлях у мясцінах, дзе расло шмат дрэў, пераважна ліп [14].

Ліпск. Старажылы тлумачаць паходжанне назвы тым, што на вуліцах вёскі расце шмат ліп, якія здаўна з'яўляліся адметнасцю гэтай мясцовасці [6].

Літва. 1) Існуюць меркаванні аб тым, што назва *Літва*, звязваючыся з корнем *"лі"* ў беларускім *"ліць"*, у літоўскім *"ліетус"* (дождж), азначае жыхароў вільготнай мясцовасці. Тапонім *Літва* захаваўся ў тых мясцовасцях, дзе ў свой час знаходзіліся землі летапіснай Літвы. Населеныя пункты з такой назвай сустракаюцца ў Слонімскім (Гродзенская вобл.), Ляхавіцкім (Брэсцкая вобл.), Уздзенскім, Стаўбцоўскім, Маладзечанскім (Мінская вобл.) раёнах. Гэта карэнныя назвы, якія супадаюць з летапіснай назвай *"Літва"* і якія маюцца толькі ва ўказаных рэгіёнах [4].

2) Назва-этнонім: паселішча, заснаванае або заселенае ў мінулым літоўскім насельніцтвам [18].

Лойкаў лужок. *(мікр.)* У Сваятычах – забалочанае месца сярод поля. Назвалі так таму, што ля яго стаіць Лойкаў хутар.

Лотва. У аснове назвы тэрмін "*лотва*" – невялікае паніжэнне, пераўвільгатнёнае месца. Ад дадзенай беларускай назвы паходзіць *лотаць* – расліна калужніца [18].

Лужкі. *(мікр.)* Урочышча на паўночны захад ад вёскі Мыслабаж, мяжуе з ракой Шчара, часткова падтопленая тэрыторыя ў выніку ўтварэння вадасховішча Шчара.

Лысая гара. *(мікр.)* Узвышша ў паўночна-ўсходнім накірунку ад вёскі Навасёлкі, глеба якога складаецца з пясчанікаў і камяніцы. Менавіта па гэтай прычыне расліннасці там мала. У мясцовых жыхароў дадзенае месца асацыіруецца са зборышчам ведзьмакоў і ўсялякае нечысці.

Ляхавічы. 1) Паводле падання, паходжанне назвы Ляхавічы звязана з імем мясцовага Робін Гуда – *Юркі Ляха,* што ўзначаліў групоўку сялян для помсты панам, якія надта здекваліся і лупцавалі сваіх прыгонных. Ляхам яго празвалі за тое, што яму давялося ў пэўны час пабыць у польскім палоне, але неяк збег і дабраўся да родных мясцін. З таго часу ён, калі злаваўся, то лаяўся толькі па-польску, або па-панску, як гаварылі іншыя. За гэта і стаў ён Ляхам. Ляхавы змоўшчыкі багатым гаспадарам ды яснавяльможным асобам праехаць нідзе бесперашкодна не давалі. Забіваць нікога не забівалі, але абрабоўвалі да апошняй ніткі: залатыя дукаты пазабіраюць, адлупцуюць так, што ў дванаццатым калене закажаш і будзе што нашчадкам прыгадаць. А то дадуць вяльможнаму дыхту, распрануць і ў чым маці нарадзіла выпусцяць прагуляцца па лясной дарозе, адкуль да бліжэйшага жылля добрыя суткі дабірацца трэба. А аднаго распранулі і “спісаным” лазою азадкам наперад да дуба прывязалі, што на перакрыжаванні дзвюх дарог расце. Многіх паноў яны так правучылі. З таго часу, як толькі ехаў які пан, сяляне, жартуючы паміж сабою, абавязкова вымаўлялі: “Во, яшчэ адзін Ляхаў хрэснік папёр!”. Паноў тых і іх нашчадкаў *Ляхавічамі* звалі, мянушка гэткая, як другое прозвішча, была. Мясцовыя жыхары заўсёды так казалі, калі побач чужых не бачылі. Нехта з тых нашчадкаў на гэтым самым месцы асеў, дзе зараз горад. З прозвішчам такім тут і сёння жыхары сустракаюцца [1].

2) Горад Ляхавічы вядомы з XV стагоддзя як цэнтр Ляхавіцкай воласці і маёнтка. Прыкладна да XVI стагоддзя павінна была ўзнікнуць і назва згаданых вёсак, бо якраз да гэтага часу назіралася прадуктыўнасць айконімаў[5] на *-ічы*. У аснове

[5] Айканіміка – раздзел тапанімікі, які вывучае айконімы – уласныя назвы паселішчаў (населеных пунктаў).

назвы *Ляхавічы* ляжыць калектыўная мянушка *ляхавічы*. Што яна азначала? Магчыма, тое, што ўсё першапачатковае насельніцтва вёскі было *“ляшскага”*, гэта значыць польскага паходжання, а магчыма і тое, што нейкія адносіны да ляхаў-палякаў мелі толькі самыя першыя ляхавіцкія гаспадары, якія маглі насіць мянушку тыпу *Лях*. Падданыя (ці патомкі?) *Ляха* ці *Ляхаў* (гаспадароў-заснавальнікаў магло быць некалькі) лічыліся *ляхавічамі*. Па асацыяцыі месца іх жыхарства таксама стала называцца *Ляхавічамі*.

Канкрэтныя гістарычныя абставіны ўзнікнення назвы *Ляхавічы* на тэрыторыі Беларусі ў кожным выпадку яе фіксацыі вызначыць даволі складана. Гэтае найменне трэба разглядаць у сувязі з іншымі айконімамі з асновай *Лях-*.

Гаворка ідзе пра наступныя айконімы: *Ля́хі* або *Ляхі́* (вёскі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці, Вілейскага, Мінскага. Нясвіжскага раёнаў Мінскай вобласці, Віцебскага і Ушацкага раёнаў Віцебскай вобласці, Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці); *Ляхаўка* (вёскі Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, Бялыніцкага і Шклоўскага раёнаў Магілёўскай вобласці, Гарадоцкага і Дубровенскага раёнаў Віцебскай вобласці, Барысаўскага і Любанскага раёнаў Мінскай вобласці); *Ляхаўцы* (вёскі Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці, Мазырскага раёна Гомельскай вобласці, Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці); *Ляхаўшчына* (вёскі Чавускага раёна Магілёўскай вобласці; Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці) і інш.

Некаторыя з гэтых найменняў, асабліва тыя, што фіксуюцца ў паўднёвых раёнах Беларусі, у тым ліку і назва горада *Ляхавічы*, маглі з’явіцца на карце Беларусі яшчэ ў старажытнаўсходнеславянскі час, калі назва *ляхі* была абагульненым абазначэннем заходнеславянскіх этнадыялектных груповак на тэрыторыі сучаснай Польшчы і ў Паўднёвай Прыбалтыцы.

Трэба мець на ўвазе і такую акалічнасць: слова *лях* ужывалася ў Беларусі не толькі ў першасным сваім этнанімічным значэнні “палякі”, але і ў другасных значэннях “людзі каталіцкага веравызнання”; “апалячаная шляхта”; “беларусы-каталікі”. І калі ўзнікненне такіх больш старажытных назваў, як *Ляхі*, *Ляхавічы*, *Ляхаўцы*, яшчэ можна звязваць з рэальнымі ляхамі-палякамі, то ў найменнях тыпу *Ляхаўшчына* ці *Ляхава* (вёскі Слуцкага раёна Мінскай вобласці, Ушацкага і Шумілінскага раёнаў Віцебскай вобласці) трэба, хутчэй за ўсё, бачыць адлюстраванне мянушак ці нават прозвішчаў заснавальнікаў пасяленняў і гаспадароў-каталікоў.

Яшчэ адна цікавая тапанімічная дэталь, якая датычыцца горада Ляхавічы: ён стаіць на рэчцы Ведзьма (прыток Шчары). Нічога агульнага з дэманічнай істотай, звязанай з прыроднымі сіламі, назва рэчкі не мае. Тут – звычайнае сугучча ці, хутчэй, фанетычная “падгонка” незразумелай назвы пад вядомае слова.

У гідраніме *Ведзьма* маецца старажытны інтэрнацыянальны корань *вед*-, які ўказваў на ваду. Гэтую назву, як вынікае з яе структуры (наяўнасць суфікса-фарманта *-ма*), пакінуў пасля сябе, хутчэй за ўсё, народ фіна-вугорскага паходжання [9].

3) *Ляхавічы* – нашчадкі чалавека па мянушцы або прозвішчы *Лях, Ляхаў* [6, 18].

4) У аснове назвы – слова *ляхі* (палякі), вельмі распаўсюджанае ў мінулым і шырока адлюстраванае ў геаграфічных назвах. Па форме нагадвае назвы, утвораныя ад прозвішчаў, але тут маецца на ўвазе не прозвішча, а этнічная прыналежнасць (параўнайце назвы: Татарынавічы, Латыголічы і г.д.) [16, 18].

5) Па-беларуску “*ляха*”, а па-руску “*леха*” – гэта расчышчаны ў лесе ўчастак, поле. У. І. Даль яшчэ называе гэтае слова градой, палоскай зямлі. У старых кнігах чытаем: “И возлегаша на лехи, по

сту и пятдесятъ”. Гэта фіна-вугорскае слова, якое пазначае меру зямлі, адну дванаццатую частку дзесяціны. Разбіваць поле на ляхі азначала дзяліць раллю. Сяляне ў старажытнасці займаліся гэтым кожную вясну. У дадзенай мясцовасці жыў чалавек, які займаўся гэтым рамяством – каморнік. У яго магла быць адпаведная мянушка, якая па-беларуску так і гучыць – *Лях*. Дарэчы, беларускае прозвішча *Лях* як раз і адбылася ад тых самых дзельнікаў раллі [21].

М

Мазо(у)ркаўшчына. *(мікр.)* Лясны масіў на поўдзень ад вёскі Мыслабаж бліжэй да вёскі Мазуркі. На гэтай тэрыторыі знаходзілася шмат хутароў, якія адносіліся да маёнтка Мазуркі.

Мазуркі. 1) Такія назвы, як *Мазуркі*, *Мазуры*, *Мазуршчына* паходзяць ад імя этнічнай групы палякаў, выхадцаў з Мазурыі на паўночным усходзе Польшчы. Так называлі таксама племянную групу балтыйскіх народаў [4, 18].

2) Паняцце *мазур* шырока прадстаўлена ў лексіцы беларускай і польскай моў, напрыклад, у Якуба Коласа: “Яны ж і не простыя палякі, а з мазураў, а мазуры па-іхняму і ёсць самыя сапраўдныя палякі” (Якуб Колас. Творы, т. 5. Мінск, 1962, с. 261) [18].

Мазурыха. *(мікр.)* Цяперашняя вуліца Г. Здановіча ў вёсцы Крывошын. Злева па вуліцы было поле, якое называлася Мазурыхай.

Макараўшчына. *(мікр.)* У паўднёва-ўсходнім накірунку ад вёскі Навасёлкі паміж двума невялічкімі рукавамі ракі Ведзьма ёсць заліўныя лугі, месца заўсёды мокрае. Спачатку называлі як Макроўшчына.

Макееўшчына. У аснове назвы ўласнае асабовае імя *Макей* або прозвішчы *Макей*, *Макееў*, *Макееўскі*. Фармант *-еўшчына* абазначае індывідуальную прыналежнасць былога ўладальніка, ад якога на правах спадчыны або куплі-продажу паселішча перайшло ў распараджэнне каго-небудзь іншага [6].

Малінавая гара. *(мікр.)* 1) Узгорак у вёсцы Жарабковічы адразу за чыгункай, які атрымаў назву ад колеру глебы, якая была па складу падобная да гліны і па колеру нагадвала ягады маліны.

2) Існуе паданне пра вельмі скупога чалавека, які жыў калісьці ў гэтых мясцінах. Што ён толькі не рабіў, каб людзі не бачылі яго запасаў: трымаў шмат сабак, абгарадзіўся высокім частаколам, выкапаў глыбокі роў. Аднойчы вяскоўцы ўбачылі, што ён садзіць вакол сядзібы маліннік. Аднак праз колькі год кусты маліннiку так разрасліся, што ўся зямля вакол сядзібы Скупога парасла маліннікам. Не стала поле даваць багаты ўраджай, бо ўсе сокі з яе высмоктваў маліннік. І чым больш Скупы змагаўся з ім, тым больш ён разрастаўся. Доўгі час на гэтым узгорку рос толькі маліннік. І назву далі гэтаму месцу – Малінавая гара.

Маргель. *(мікр.)* У Сваятычах – поле, якое называлі так таму, што яно знаходзілася супраць могілкаў.

Маскоўшчына. *(мікр.)* Урочышча каля вёскі Востраў. Існуе дзве версіі паходжання назвы: паводле першай назва ўзнікла таму, што раней побач праходзіла маскоўская шаша, паводле другой – назва пайшла ад таго, што ўрочышча было вялікае, як Масква.

Мацэляўшчына. *(мікр.)* Сенажаць у пойме ракі Шчара на захад – паўночны захад ад вёскі Мыслабаж.

Мепількаўшчына. *(мікр.)* Лес паміж вёскамі Альхоўцы і Зад'ворье.

Міладоўшчына. *(мікр.)* Былыя землі графа Міладоўскага.

Мілыя дарожкі. *(мікр.)* У Крывошыне – лясны масіў управа за вуліцай Рэпіхоўская. Некалі па гэтым дарожкам хадзіла графіня Ірына Патоцкая і гаварыла, што дарожкі вельмі прыгожыя і мілыя яе сэрцу, адсюль і пайшла назва.

Мінічы. Назва паходзіць ад распаўсюджанага прозвішча *Мініч* [4, 16, 17].

Міха(й)лаўка. *(гідр.)* Рака, левы прыток ракі Шчара, бярэ свой выток з урочышча Міхалаўшчына, цягнецца ад рогу Гасцінца з Борам з паўднёвага ўсходу наўскос да вёскі Мыслабаж і агінае яе з поўначы. У другой палове XX стагоддзя была праведзена меліярацыя, што прывяло да асушэння гэтай тэрыторыі. У наш час рака пасля асушальных работ сярод мясцовых жыхароў часцей завецца як Канава.

Міхалаўшчына. *(мікр.)* Урочышча, нізіннае, балоцістае месца, прыстасаванае ў наш час пад выпас буйнай рагатай жывёлы. Месца вытоку рэчкі Міха(й)лаўка.

Мыслабаж. 1) Ад старажытнага двухсастаўнага імя *Мыслабог*, што азначае “не забываць пра Бога” з далучэннем суфікса прыналежнасці *-jь*. На стыку [*г*] і [*j*] адбылося чаргаванне [*г*] – [*ж*], у выніку чаго назва набыла форму *Мыслабажь*, а пасля зацвярдзення [*ж*] – *Мыслабаж* [6].

2) Сярод жыхароў вёскі існуе паданне аб нейкім чалавеку па прозвішчу *Мысламыш*, які, прыехаўшы ў вёску, пабудаваў там кузню. Быццам бы ад яго імя і пайшла назва паселішча. А вось іншая версія грунтуецца на назве, складзенай з двух частак – *Мысль Божая*. Гэта значыць спакойнае жыццё, што дорыць людзям Бог, адводзячы грымоты ад вёскі. З цягам часу назва вёскі мянялася. У 1535 годзе назва вёскі гучала як *Мысламыш*, у 1561 – як *Намыслабаж*, у 1570 – як *Мыслі-баж*. Спачатку Мыслабаж уяўляла сабой хутарское пасяленне, і толькі паступова хутары пачалі аб’ядноўвацца ў вёску [4].

3) Назва пайшла ад першага ўладальніка гэтае зямлі, Мысламыша Башыча, ён атрымаў гэтую зямлю ў канцы XV стагоддзя, аднак пасля яго смерці спадкаемцы прадалі яе Гаштольду ў 1509 годзе [10].

4) Назва, вытворная ад старажытнарускага імя *Мыслобож*, аналагічнага імю *Мстибож* [18].

Мышанка. *(гідр.)* Рэчка Мышанка атрымала сваю назву ад невялікага грызуна – мышы, што шмат вадзілася ля яе берагоў [14, 18].

Мядзведзічы. Сярод мясцовых жыхароў існуе паданне пра панскую прыгажуню-дачку, якая аднойчы падчас прагулкі па лесе заблукала і спаткалася з мядзведзем, якіх шмат было ў тыя часы ў наваколлі. Кінулася дзяўчына наўцёкі, але дагнаў яе люты звер і жыцця пазбавіў. Пан пахаваў дачку і пабудаваў там каплічку. А гэтае месца пачало называцца Мядзведзічы. Князь загадаў сяліцца тут прыгонным. Вось з той пары і пачала вёска называцца Мядзведзічы [4, 19].

Н

Набярэжная. Да 1971 года – Вонькі. Назва новая, дадзеная замест старой, немілагучнай [18]. Назва-арыенцір: вёска пабудавана на беразе вадасховішча Мінічы.

Навапельня. *(мікр.)* Месца з ямамі ад снарадаў у лесе каля вёскі Альхоўцы.

Навасёлкі. Назва вельмі многіх вёсак на Беларусі. Сэнс яе зразумелы: новае пасяленне, новая вёска [16, 17].

Нача. 1) Такую назву маюць многія невялічкія рэчкі, прытокі Бярэзіны, Бабра, Нёмана, Лані, Заходняй Дзвіны. Амаль што каля кожнай з іх ёсць аднайменныя паселішчы. Назвы паходзяць,

магчыма, ад старажытнага балтыйскага тэрміна *nasus*, які меў прыблізны сэнс – “урадлівы”. Як відаць, гэтыя месцы былі першапачатковымі раёнамі земляробства, расчыстак і распашак сярод лясных прастораў. Ёсць падобнае слова са значэннем “прадукцыйны” ў сучаснай літоўскай мове [4, 16].

2) Выразна выяўляецца сувязь са старабеларускім словам “*нача*” – пачатак, новая пахата. Зараз гэтае слова ўжываецца параўнальна рэдка: *нача* – першы сноп пры зажынках (пачатак жніва), *заначаць* – зрабіць пачын.

3) *(гідр.)* Назва ракі паходзіць ад старажытнага беларускага слова “*нача*”, што азначае пачатак земляробства на асушаных, адваяваных у балот землях. Яшчэ слова “*нач*” азначала пачатак жніва, першы сноп [14].

Нівішча. Са старажытнага падання, якое пераходзіла з пакалення ў пакаленне, вядома, што селішча, дзе была адна вялікая ніва, і назвалі – Нівішча [25].

Новінкі. *(мікр.)* Урочышча на паўднёвым захадзе вёскі Тухавічы; новая зямля, новы надзел з часу паншчыны.

П

Падбарочча. 1) Назва ўзнікла ад слова *бор*, пад які кіруецца рака Шчара, што цячэ недалёка [17].

2) Назва вёскі пайшла ад наваколля: пад борам, што шумеў непадалёку селішча, цякла невялічкая рэчка. Так узнікла *Падбарэчча*. З гадамі галосная “э” трансфармавалася ў “о” – *Падбарочча* [25].

Падбірагі. *(мікр.)* Сенажаць у пойме ракі Шчара на паўночны захад ад вёскі Мыслабаж. У гэтым месцы расла вельмі добрая

трава, якая падбіралася, сбіралася да самай рэчкі, бо тут быў добры бераг.

Падлаззе. Лічыцца, што назва пайшла ад таго, што вёска пабудавалася на месцы невялікага хутара, назва якога была *Падлазок*. А хутар меў такую назву таму, што побач расло шмат лазы.

Падлессе. 1) Мясцовыя жыхары звязваюць ўзнікненне назвы вёскі з паданнем, паводле якога колішні ўладар зямель пан Ельскі выгнаў парабка за тое, што ён, абараняючыся, забіў збегшага з цэпу панскага сабаку. Кінуўся парабак да пана ў ногі літасці прасіць. Пан спачатку ніяк не згаджаўся пашкадаваць прыгоннага, ды потым дазволіў яму застацца ў вёсцы, але загадаў пасяліцца не ў ёй самой, а на ўскрайку лесу. Пазней каля хаты выгнанніка пачалі сяліцца людзі. Карчавалі лес, будаваліся. Так і вырасла вёска, якой далі назву Падлессе. Першапачаткова вёска стаяла каля чыгуначнага перагону Баранавічы – Слуцк. Але пасля вялікага пажару, які адбыўся ў 1700 годзе, жыхары не сталі сяліцца на старым месцы, а перабраліся на тое, дзе і па сёняшні дзень знаходзіцца Падлессе. Назва ў вёскі засталася ранейшаю [4].

2) Назва некалькіх вёсак у розных частках БССР; Вялікае Падлессе – вёска Ляхавіцкага раёна. Назва паходзіць ад ландшафтнага тэрміна – ускраіна лесу, мясцовасць каля лесу [16, 17].

Падоўжная лагчына. *(мікр.)* Лагчына, поплаў, нізкае, балоцістае месца з крыніцамі ў пойме ракі Свідроўкі. Вельмі доўгая, цягнецца ад вёскі Рачканы ўздоўж Гаслаўскага лесу да урочышча Камяніца ў вёсцы Гаслаўшчына.

Падсакольная горка. *(мікр.)* Узвышша паміж вёскамі Альхоўцы і Падсаколле.

Падсобнае. *(мікр.)* Тэрыторыя ў вёсцы Сваятычы, дзе адразу пасля вайны была створана падсобная ваенная гаспадарка. Таксама ўжываецца ў горадзе Ляхавічы для тэрыторый,

прылеглых да падсобнай гаспадаркі Ляхавіцкага кансервавага завода.

Паўлюкоўшчына. *(мікр.)* Урочышча, да 1939 года стаяла сядзіба паноў Масальскіх, пазней у сядзібе існавала школа. Да 1972 года – вёска Начаўскага с/с. У 1535 годзе *Павликовщина* – сяло Ляхавіцкай воласці, уласнасць пана А. М. Гаштольда. Да 1584 года *Павлюковщина* – фальварак Ляхавіцкай воласці, шляхецкая ўласнасць.

Пад'язаўле(я). Назва-арыенцір: месца каля рачнога перакату, запруды, возера [18].

Памкоў хутар. *(мікр.)* Паляна ў лесе каля вёскі Альхоўцы, дзе некалі быў хутар.

Панале. *(мікр.)* Тэрыторыя ў вёсцы Свяціца, дзе калісьці было бульбяное поле, а зараз размясціўся сучасны пасёлак [26].

Папова балота. *(мікр.)* Сенажаць далей за Падбірагамі на астраўку, дзе Шчара рабіла паўкруг. Там была самая лепшая сенажаць, на якім ляхавіцкія папы мелі надзелы.

Папоў сад. *(мікр.)* Месца каля ракі Шчара насупраць цяперашняга ільнозавода. Калісьці, да Першай сусветнай вайны, там стаяла драўляная царква, і каля яе жыў святар. Падчас вайны царква згарэла, а рэшткі сада засталіся.

Пастаўнік. *(мікр.) Пастаўнік* – загарадка для жывёлы ў полі; загароджаны ўчастак сенажаці для выпасу жывёлы. У розных раёнах Брэсцкай і іншых абласцей Беларусі адзначаны мікратапонімы ад гэтага слова: *пастаўнік(і)* – сенажаць; выган і сенажаць [1]. Шырока распаўсюджаная назва.

Патапавічы. *Патапавічы* – нашчадкі чалавека па імені *Патап* або па прозвішчы *Патап*, *Патапаў*. *Патап* – скарочаны варыянт рускага каляндарнага імя *Потапий* [6].

Патапельны лужок. *(мікр.)* Месца ў лесе каля вёскі Задвор'е, у бок вёскі Падбарочча. Згодна з мясцовым паданнем,

некалі там было сяло, жылі людзі, гадавалася скаціна, і аднойчы за адну ноч усё патапілася.

Пашкоўцы. Назва ўтворана ад прозвішчаў *Пашэвіч*, *Пашковіч*, *Пашко*, *Пашкоў* [18].

Перахрэсце. Назва-арыенцір: вёска на месцы перасячэння шляхоў. Ад слова *перахрэсце* – “скрыжаванне дарог” (параўн. *перахрэст* – “скрыжаванне”). Перахрэсце, перахрэст часта ўтвараюць лясныя дарожкі і сцяжынкі. Урочышчы ў такіх месцах называюцца Перахрэсце, Перахрэсніца [6, 16, 17].

Пірштукі. Паводле мясцовага падання, жыла калісьці ў гэтых мясцінах вялікая сям’я. Гаспадар быў чалавекам вялікага розуму, але вось абдзяліў яго Бог ростам і мажнасцю: сярод тых, хто побач, быў бы палец-мезенец. А паколькі належаў род да балцкіх насельнікаў, то пачалі чалавека звать *піштас*, што па-іхняму значыць “палец”. З цягам часу гэтай мянушкай сталі клікаць усіх сваякоў гэтай сям’і. А яшчэ пазней яна стала прозвішчам і ўвасобілася ў назве вёскі. Сёння тут і ў наваколлі шмат людзей з такім прозвішчам, хаця на выгляд многія з іх даволі высокія і моцныя [3].

Пітомнік. *(мікр.)* Закінутая дзялянка каля вёскі Русінавічы, дзе пасля Вялікай Айчыннай вайны гадавалі саджанцы лесу.

Пляцы (омтар, пеўні). *(мікр.)* Поле каля вёскі Сваятычы, у бок горада Сноў.

Пранчакі. 1) *Пранчакі* – дзеці, нашчадкі чалавека па імені *Пран*, *Пранак*, *Пранко* – вуснамоўны варыянт імя *Прохар* (параўн. літоўскае імя *Пран*) [6].

2) Назва, якая ўтварылася ад імя *Франц*. У беларуска-літоўскай трансфармацыі пры пераходзе *ф* у *п* (напрыклад, *Франц*, *Франусь* і літоўскае *Пранас*) і *а* у *о* [18].

Прыдаткі. *(мікр.)* Месцаразмяшчэнне пасёлка ў вёсцы Сваятычы. Раней на гэтых землях сялянам да асноўнага надзелу зямлі давалі яшчэ дадатковы.

Пусткі. *(мікр.)* Поле за вёскай Задвор'е, на якім ніколі нічога не расло, акрамя травы.

Пяварава яма. *(мікр.)* Невялікія азерцы, якія некалі былі на месцы цяперашняга вадасховішча Нетчын.

Пясчанка. *(мікр.)* Лясны масіў каля вёскі Крывошын. У ім было шмат жоўтага пяску, людзі капалі яго на будаўніцтва.

Р

Рагачы. 1) *Рагачы* – першапасяленцы, якія знаходзіліся ў роднасных сувязях і мелі агульныя мянушку або прозвішча *Рагач (Рогач)* і сяліліся разам [6].

2) Існуе паданне, што ў наваколлі гэтай вёскі ў свой час раслі вельмі незвычайныя дрэвы, па форме нагадваўшыя рагач. Сяляне рабілі з тых дрэў прылады працы, казалі адзін аднаму: "Пайшлі ў рагачы"[4].

Раек. *(мікр.)* Лясны масіў каля вёскі Крывошын.

Рамашкі. 1) Паселішча заснавалі *Рамашкі* – некалькі родзічаў па імені (ці прозвішчы) агульнага продка *Рамашка*. Асновай для тапоніма магло паслужыць таксама агульнае прозвішча першапасяленцаў. Уласнае асабовае імя *Рамашка* з'яўляецца гутарковай формай каляндарнага імя *Роман*. У старабеларускіх пісьмовых крыніцах адзначаецца з першай паловы XVI стагоддзя ў форме *Ромашко*: *Ромашко Нарушевич*, *Ромашко Петькович* [6, 18].

2) Паводле расказаў мясцовых жыхароў, чаму гэтую вёсачку назвалі Рамашкі, дакладна ніхто не ведае. Кажуць, што наўкол

паселішча спрадвеку расло вельмі многа рамонкаў і мясцовыя дзяўчаты любілі ўпрыгожваць сябе вянкамі, сплеценымі з гэтых пяшчотных кветак [24].

Рачканы. 1) Існуе паданне, паводле якога ў навакольных лясах жыла страшная жанчына-чараўніца, якая забівала любога сустрэчнага, не звяртаючы ўвагі на тое, кім ён быў. Казалі, што гэта была своеасаблівая помста за адрынутае некалі адным багатым хлопцам каханне. З тае пары пайшла чараўніца ў лес жыць і там, на глухіх сцяжынках ды дарогах, тварыла свае чорныя справы, пакуль аднойчы не завітаў у тыя мясціны смелы жаўнер, які здолеў забіць ліхадзейку. Ён прабіў ёй грудзі сваімі *рачканамі* – вострымі ражнамі, што зрабіў са ствала маладой асіны. Засыпалі пяском ды каменнямі закідалі вяскоўцы гэтую нечысць, а па цэнтры магілы рачканы ўбілі, каб не пераварочвалася і ў снах нікому не паказвалася. Жаўнеру за паслугі далі надзел зямлі, дзе збудаваў ён хаціну. Пазней тут ужо вёска з'явілася з назвай Рачканы, ад назвы той традыцыйнай зброі [1].

2) За лесам, які раней належаў пану Магільніцкаму, знаходзілася вёска. Тут, дзе цяпер вёска Рачканы, раней толькі былі топкія балоты. Адсюль бралі пачатак маленькія рачулкі. Потым яны зліваліся ў адну невялічкую раку. І вось ад слова *рака*, *рачушка*, *рэчка* і пайшла назва вёскі Рачканы. Іншыя сцвярджаюць, што ў гэтай маленькай рачушцы вялося шмат ракаў [5, 17].

3) Назва ад прозвішчаў *Рачок, Рачкан, Рачкун, Рачкоў* [18].

Ройства. *(мікр.)* Невялікія лужкі каля паселішчаў. Паходзіць ад слова "*ройста*" – поле на месцы асушанага балота. Сустракаецца ў вёсках Вялікая Лотва, Тальмінавічы.

Руда. *(мікр.)* Самае "топкае", гразкае балота, багна, знаходзілася на рагу, дзе рака Ведзьма ўпадае ў Шчару. Пры Рудзе пасвілі кароў з вёскі Мыслабаж. Назва ўзнікла з-за таго, што тут здабывалі жалезную (балотную) руду ці з-за рудога, іржавага

колеру багны. Месца Руда ў савецкі час часткова асушылі, цяпер там дачны пасёлак жыхароў горада Ляхавічы і лясны масіў.

Русінавічы. 1) Назва вёскі ў пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ўскосна ў 1568 годзе як сяло, уласнасць шляхціча Я. Магільніцкага [7]. Вясковыя старажылы падзяляюць вёску на дзве часткі: як ехаць з Ляхавічаў, то злева стаіць новая вёска Русінавічы, а справа старая – Рэйтанава. Наконт назвы Русінавічы існуюць такія паданні. Расказваюць, што пасяліўся насупраць Рэйтанава нейкі пан, выхадзец з Расіі. Каля яго пачалі сяліцца рускія сем'і. Таму і назвалі вёску Русінавічы. А яшчэ кажуць, што быццам бы трапіла з гэтых месцаў шмат мужыкоў у рэкруты ў расейскую армію. Вярнуліся яны дамоў "абрусеўшымі". А можа, назва пайшла ад назвы дзяржавы – Русь ці Белая Русь [4, 20].

2) У аснове назвы прозвішча *Русін* [17].

3) Назва паходзіць ад этнонімаў *русский, русин* [18].

Рэйтанава. Гэта назва чыгуначнай станцыі ў вёсцы Русінавічы, а таксама вуліцы, якая цягнецца ўздоўж чыгункі. Калі ў 80-х гадах XIX стагоддзя была пабудавана Палеская чыгунка, пан *Рэйтан* занаваў чыгуначную станцыю. Гэта ў многім змяніла жыццё тутэйшых сялян. Некаторыя з іх сталі займацца перавозкай розных грузаў. Ездзілі ў Клецк, Слуцк, іншыя гарады. Хутка з'явілася гасцініца, шмат магазінаў, укладальнікамі якіх былі яўрэі. Так утварылася цэлая вуліца, якую, як і станцыю, сталі называць Рэйтанава [7].

С

Савейкі. 1) Паселішча, заснаванае родзічамі, агульным продкам якіх быў чалавек па імені або прозвішчы *Савейка*. *Савейка* – памяншальная форма да *Савва* [6].

2) Па словах мясцовых жыхароў, назва Савейкі паходзіць ад слова “*сава*”. Сапраўды, у паўднёвай частцы мясцовага парка ў дуплах старых дрэў па сённяшні дзень гняздзяцца совы. У старыя часы гэты куток называлі “савіным месцам”. Магчыма, ад яго і пайшла назва вёскі [15].

3) Назва-тэрмін: рус. *совейки* – пяшчаны пляж, нанос, часам дзюна [18].

Савонка. *(мікр.)* Участак поля па дарозе з Крывошына на Ляхавічы, управа за вескай.

Сакуны. Патранімічная назва ад асновы *сакі* (энтонім) ці зменена нямецкай асновы *sak* – мяшок. Калі браць за аснову *сакі*, то можна дапусціць этнанімічнае паходжанне другога парадку (праз мянушкі). *Сакі* – група іранамоўных качавых плямёнаў, якія жылі ў VIII–IX стагоддзях да н.э. у Заволжы і Сярэдняй Азіі, перамяшчаліся разам з іншымі народамі на ўсход і захад. Даволі шырокае распаўсюджванне назваў і прозвішчаў з гэтай асновай дае падставу прызнаваць такую сувязь (напрыклад, возера Сакі ў Крыме). Наяўнасць у Беларусі іншых этнанімічных назваў можа служыць добрай аналогіяй. Менш верагодна збліжэнне з прозвішчам *Сак (Зак)* нямецкага паходжання [18].

Самалётная яма. *(мікр.)* Невялікае азярцо ў лесе каля вёскі Альхоўцы, дзе некалі быў збіты самалёт.

Сваятычы. 1) У даўнія часы тэрыторыя нашай Беларусі была мала заселенай. Групы людзей у пошуках прыдатных для пражывання месцаў накіроўваліся на новыя землі. Гэта былі і блізкія нам славянскія плямёны, і балты, мова, звычкі, гаспадараванне якіх значна адрозніваліся ад славянскіх. Паміж імі адбываліся крывавыя сутычкі, але іншы раз разыходзіліся з мірам і сяліліся побач. З’явіліся перасяленцы і на Ляхавіччыне. Хто яны? Свае ці чужыя? Паслалі надзейных мужчын аб усім

даведацца. Высланыя ў разведку пачулі ад чужакоў адзінкавыя словы гамонкі: “жыта”, “араць”. Значыць, гэта свае людзі. Падалі для ўпэўненасці ўмоўны гук, падобны клічу ваўка. Тыя ўстрывожыліся, схапіліся, узяліся за зброю. Але, аб чымсьці пашаптаўшы, адзін з іх падаў падобны гук на той, які толькі што прагучаў. Ён азначаў – “свае”. Разведчыкі вырашылі падысці да вогнішча і былі прыняты мірна. Пасля чаго яны вярнуліся па астатніх спадарожнікаў. Сустрэліся ўсе і сталі жыць тут. А пасяленне сваё з цягам часу так і назвалі – Сваятычы [3].

2) Мясцовае паданне сведчыць пра тое, што назва вёскі пайшла ад слова “*свойтык*”. Гэта значыць, што юнакі жаніліся на дзяўчынах-аднавяскоўках – “*свайтыкаваліся*” [4].

3) Назва занатавала сваяцкія адносіны – *сваякі* [18].

Свідроўка. *(гідр.)* 1) Рака, левы прыток рака Шчара. Магчыма, што сваю назву атрымала ад слоў *свідраваць*, *віраваць* за свой неспакойны нораў падчас моцных дажджоў і паводак.

2) *Свідроўка* – таму, што яна сама прасвідравала водамі ўласны шлях [14].

Свяціца. 1) Ад першапачатковай назвы паселішча – *Свецічы*. У 1584 годзе князь Радзівіл падараваў вёску з такой назвай Нясвіжскай калегіі езуітаў. Вёска з назвай *Свяціца* прыгадваецца ў 1639 годзе як сяло Ліпскай воласці, уласнасць магнатаў Радзівілаў [26].

2) Існуе паданне, якое распавядае пра гісторыю кахання паміж дачкой багатага гаспадара і парабкам. Паводле падання, у незапамятныя часы на месцы сучасных Ляхавіч было агромністае возера, на беразе якога раскінулася прыгожае паселішча. Людзі ў ім жылі надта багатыя, у роскашы панавалі, але ж былі вельмі сквапныя. У адной хаце жыў надта багаты гаспадар, які не меў сыноў-нашчадкаў. Сам з жонкай ды дачка адзіная, якую хацелі выгадаваць такой жа, як і самі: сквапнай,

абыякавай да чужога гора і бяды. Але дзяўчына нічога благога не ўспрымала ад бацькоў, добрую мела душу. І быў у іхняй сям'і сярод многіх іншых парабкаў адзін хлопец з бедных, сірата круглы. Цягнула іх адно да аднаго. Аднаго разу парабак асмеліўся і пайшоў да гаспадара прасіць рукі яго дачкі. Дзяўчына, ведаўшы, што бацька адкажа, стала пагражаць самагубствам. Тады гаспадар даў згоду, але пры ўмове, што хлопец вычарпае ўсю ваду з возера. Выйшлі з хаты закаханыя, жыць ім абодвум не хочацца. Пайшлі паціху па вуліцы ды сустрэлі неабыякавага падарожнага, якому распавялі сваю гісторыю. Чалавек наказаў ім ісці прама і не азірацца, ды застацца там жыць, дзе спадабаецца. Пайшлі яны, але азірнуцца карціць. Што там робіцца? Не вытрымалі, глянулі – і спалохаліся: там, дзе возера было, суша стала, а дзе вёска іхняя – балота ўтварылася. Як прыпусцілі закаханыя, то доўга беглі, пакуль не спыніліся. Сталі жыць і пабудавалі царкву, бо падалося, што той падарожны, які ім дапамог, быў сам Бог. Інакш хто ж яшчэ такое здзейсніць можа? Вёску пазней Святіцай назвалі, ад таго, што святая воля здзейснілася [1].

3) Другое паданне распавядае, што аднойчы ўначы пайшоў моцны дождж, такі, што хаты пачало заліваць. Людзі кінуліся шукаць паратунку. Нехта ўспомніў пра старога дзеда, які жыў на хутары недалёка ад вёскі. Папрасілі людзі ў старога парады, як ім гэтую бяду мінуць. Той параіў трымацца разам і не пакідаць адзін аднаго ў бядзе. Супакоіліся крыху людзі. Але патоп усё павялічваўся. Раптам на вербах, нібы агеньчыкі свечак, пачалі святіцца веснавыя пупышкі. Іх святло і падказала вяскоўцам шлях да выратавання. На новым месцы людзі заснавалі вёску, і ў памяць гэтага цуда назвалі яе Святіцай [8].

4) Калі верыць трэцяй легендзе, вёска заснавана ў далёкія часы прыгоннымі сялянамі. Ратуючыся ад сваіх уладароў, яны падаліся ў глухія забалочаныя лясы. Доўга ішлі, выбіваючыся

з апошніх сіл. І калі ўжо амаль страцілі надзею выбрацца з хліпкай лясной глухамані, адчулі пад нагамі цвёрдую зямлю і ўбачылі ўперадзе святло. “Свеціцца” – вырваўся радасны крык. Невялікі пясчаны астравок быў выбраны пад сялібу, якую назвалі Свяціцай [13, 18].

Селішча. *(мікр.)* У Свяціцы – тэрыторыя, якая засялялася пазней, за межамі старой вёскі [26].

Семакоўшчына. *(мікр.)* У Крывошыне – мясцовасць за канаваю па цяперашняй вуліцы Піянерская.

Сітавая. *(мікр.)* Злева па дарозе з вёскі Крывошын на Рэпіхава; цяпер гэта вуліца Рэпіхоўская. Гэта быў выпас, дзе расло шмат сітніка, таму і пайшла назва.

Смаленікі. 1) *Смалянік* – той, хто працуе ў смалярні, смалакур; той, хто смоліць, пакрывае смалою рэчы. Паселішча магло быць так названа за тое, што ў ім жылі смаленікі-хаўруснікі або група родзічаў з аднолькавым прозвішчам *Смалянік* ці *Смаленік* (параўн. *Смаляры*) [6, 17, 18].

2) Назва можа паходзіць ад назвы расліны *смолка*, *смалёўка* (*Viscaria Bernh.* і *Silene L.*) [18].

Смалёўшчына. *(мікр.)* Сенажаць у пойме ракі Шчара на паўднёвы захад ад вёскі Мыслабаж.

Старынка. *(мікр.)* Стары лес на захад ад вёскі Навасёлкі, які калісьці з’яўляўся ўласнасцю пана, ахоўваўся яго ляснічымі.

Стральніца. *(мікр.)* Месца каля вёскі Крывошын, дзе падчас Першай сусветнай вайны для вайскоўцаў быў абсталяваны цір – “стральніца”.

Стральцы. 1) У Вялікім княстве Літоўскім любімым заняткам людзей прывілеяваных саслоўяў было паляванне. Кожны багаты аматар палявання трымаў выездженых коней, мноства парод паляўнічых сабак і цэлыя атрады стралкоў (стральцоў). Стралкі жылі на гаспадарчай зямлі ў асобным

паселішчы, якое называлася *Стральцы* ці *Стралкі*. Паводле прыналежнасці да гэтай службы стралкі і іх нашчадкі атрымалі адпаведныя імёны-мянушкі і прозвішчы. Ёсць беларускія прозвішчы *Стралец, Стралок, Стральцоў, Стралкоў, Стральчонак, Стральчэня, Стралецкі* і інш. Таму сёння немагчыма дакладна ўстанавіць, якое паселішча вядзе свой пачатак ад старажытнага пасёлка стральцоў, а якое заснавана родзічамі з агульным імем-мянушкай або прозвішчам *Стралец, Стралок* [6].

2) Існуе паданне, што ў даўнія часы паляўнічыя-стральцы дапамаглі мясцоваму князю перамагчы захопнікаў. Раней, калі вайна ці бітва якая, дык адбывалася паспалітае рушэнне – гэта значыцца, акрамя дружыны княжацкай, наёмных войскаў, у тэрміновым парадку ішлі ваяваць і людзі, якія да вайсковай справы прамога дачынення ніколі не мелі: сяляне-працаўнікі, паляўнічыя, рыбакі, гараджане. Кожны з іх узбройваўся як мог і чым мог: дзідамі, нажамі, даўбешкамі. Найбольш падрыхтаванымі сярод паспалітага рушэння, што нядзіўна, былі паляўнічыя. Іхнюю зброю складалі лукі і рагаціны, і валодалі яны імі выключна. З мінулых часоў вядома, што ў нашых мясцінах было даволі многа паляўнічых, бо звяроў і птушак усялякіх вадзілася мноства. Паляўнічыя ведалі ўсе лясы і балоты на многія дзесяткі вёрстаў навокал – гэта таксама адыгрывала немалаважную ролю. Таму яны часта служылі ці заклікаліся ў княжацкія дружыны як вопытныя праваднікі. Але даўней іх па вёсках не толькі паляўнічымі клікалі. Было ў іх і другое прозвішча – стральцы. Трэба думаць, яно больш позняе. Прыкладна тых часоў, калі з'явілася самая першая агнястрэльная зброя. Тут недзе і атрымалі яны мянушку, якая стала з цягам часу ганаровай. Далёка не кожны вясковец мог пахваліцца тым, што хоць адзін раз за ўсё жыццё выстраліў са стрэльбы. Аднаго разу напалі

на мясцовага князя далёкія ворагі – татары, а войска княжае было разаслана дробнымі атрадамі па княстве: хто павіннасці збіраў, хто за парадкам сачыў, хто па якіх іншых справах. У гэты момант і прыспелі ворагі. Разаслаў князь загад тэрмінова збірацца ў адно месца, але стала зразумела, што сіл недастаткова. Тады заклікалі ў дружыну мужыкоў ды дзецюкоў, каб родны край бараніць ад чужынцаў. Аднаго дня ў лагер завітала вялікая група (чалавек, можа, сто) людзей магутнага целаскладу з доўгімі лукамі і такімі ж доўгімі стрэламі ў калчанах, у руках яны трымалі кароткія дзіды-суліцы. Гэта былі стральцы-паляўнічыя. Калі пачалася бітва, то князь паставіў усіх паляўнічых у засаду. Хавацца тых вучыць не трэба было. На іх і пагналі татараў. Тут ужо стральцы паказалі сябе: цэлыя гурбы вершнікаў навалілі, ні адзін не здолеў збегчы. Болей таго, самі ніводнага чалавека не страцілі. Пасля бітвы, у якой ворагі былі ўшчэнт разбіты, князь, дзякуючы ўсім сваім ваярам, асобна адзначыў паляўнічых і за службу, за храбрасць падараваў ім надзелы ўласнай зямлі. Паляўнічыя заснавалі вёску на падараванай зямлі і назвалі яе Стральцы. Нават жыхароў з такім прозвішчам тут было надзвычай многа. Зараз – менеў, але сустракаюцца [1].

Сценка. *(мікр.)* На поўдзень ад вёскі Пранчакі вынайшлі месца, багатае на белую гліну, якая выкарыстоўвалася для вытворчасці фаянсу на заводзе ў Баранавічах. Пасля раскопкі кар'ера атрымаліся вялікія звалы зямлі, якія здалёк нагадвалі сценку.

Т

Талкачоўка. *(мікр.)* Хутар каля вёскі Вялікая Лотва. Назва паходзіць ад слова "*талака*". Хутчэй за ўсё на месцы, дзе ўзнікла

паселішча, нейкія сельскагаспадарчыя працы выконваліся *талакой* – старадаўнім славянскім звычаем аказваць калектыўную дапамогу ў гаспадарчых працах.

Тальмінавічы. 1) Мясцовае паданне звязвае паходжанне назвы вёскі з падзеямі Паўночнай вайны. У XVIII стагоддзі баявыя дзеянні закранулі мясцовыя вёскі. Шведскае войска раскінула свой лагер на гары, якая па сённяшні дзень носіць назву *Шведка*, а падыходы да яе з нізіны жаўнеры замініравалі. Са спалучэння слоў *“таль”* (нізіна) і *“міна”* быццам бы ўтварылася назва *Тальмінавічы* [4].

2) Назва-характарыстыка: незамярзаючыя або позна замярзаючыя вадатокі, крыніцы, рэкі. Таксама месцы, на якіх рана растаюць ці талыя грунты.

Тарфяныя. *(мікр.)* Балоцістае месца; месца распрацоўкі і здабычы торфу. Распаўсюджаны мікратапонім.

Таўкачоўка. *(мікр.)* Да ўзнікнення калгасаў на тым месцы ў вёсцы Навасёлкі калісьці быў створаны зернепрыёмны пункт, дзе зерне прынімалі ад асобных гаспадароў, а пасля па чыгунцы перавозілі ў Баранавічы. Мясцовыя жыхары кажуць, што гандаль быў нават лепш арганізаваны, чым у саміх Ляхавічах. Народу таўклося нямала, адсюль і назва.

Трабавічы. 1) У аснове назвы – балтыйскі тэрмін, які можна супаставіць з літоўскім *traba* – хата, хаціна, жылы дом. У тапаніміцы можна звязць з прозвішчам. Вядома прозвішча літоўскага князя Трабуса. Але па форме дадзенае прозвішча ўказвае на назвы мясцовасці ці паселішчы. Пэўна, гэта пасяленне спачатку было нешматлікім. Стаяла адна-дзве хаты. А ўжо потым тут пачалі сяліцца іншыя. Магло стаць і так, што вёску ці жытло балты называлі абагуленым словам *“траба”* – хата. Затым да балцкага *“траба”* быў дастасаваны славянскі суфікс *“ічы”*, і атрымалася – *Трабавічы* [3, 17].

2) Казалі, у гэтай вёсцы, як у ніякай іншай, у любую пару года здзіўлялі чысціня і парадак на любым падворку, на любой вуліцы. Усё тут было прыведзена да ладу. Агароджы роўныя, хаты ўсе дагледжаныя, няма ніякіх звалак. Ды і самі людзі ахайныя, ветлівыя, гасцінныя, прад'яўляюць да сябе строгія патрабаванні. Слова *"трэба"* з іх языка не сыходзіць, як бы вясковы закон для кожнага. "Трэба так" – казалі яны сваім аднавяскоўцам, калі нехта не надта прытрымліваўся іхняга правіла. Трэба, каб конь быў зацугляны, каб чалавек быў паголены, трэба, каб мелі прыстойны выгляд вяскоўцы. Суседзі і хто там пабываў, сталі клікаць жыхароў *"трэбавічамі"*. А затым і іх вёску. Гэта пазней яе назавуць *Трабавічамі*, так прасцей вымаўляецца.

Трацціякоўцы. Назва, утвораная ад прозвішча *Трацціяк*, вытворная ад асновы "*трэці*" – трэці сын [18].

Тумашы. *Тумашы* – група родзічаў па імені або прозвішчы іх агульнага продка *Тумаш*. Уласнае асабовае імя *Тумаш (Томаш)* – каталіцкае (польскае) імя, адпаведнае праваслаўнаму *Фома* [6].

Тупік. *(мікр.)* У Крывошыне – дарога ў бок вёскі Цыганы. Гэта была чыгуначная дарога – вузкакалейка. Па ёй паравоз перавозіў з Тупіка лес на Баранавічы. У 1953 годзе дарогу разабралі.

Туркі. 1) *Туркі́* – група родзічаў з агульным празваннем або прозвішчам *Турко, Турок* – памяншальнае ад *Тур* [6].

2) Прозвішча ўтворана ад слова *турак*. Гэтым словам называлі звычайна чужынца, які не ведаў мясцовай мовы і маўчаў [17, 18].

Тухавічы. 1) Існуюць два паданні, у якіх тлумачыцца паходжанне назвы вёскі. Першае гаворыць аб тым, што мясцовыя людзі доўгі час жылі на ўзгорках паміж непраходных "*тухлых*" балотаў. Ад іх і ўтварылася назва. Другое звязвае назву вёскі з падзеямі часоў прыгоннага права. Сяляне, ратуючыся ад сваіх

прыгнятальнікаў, уцякалі ў тыя месцы, дзе іх немагчыма было знайсці. Непраходныя балоты часта станавіліся адзіным магчымым прытулкам дзеля беглых сялян. Прозвішча аднаго з тых бегляцоў было *Тухаў*, што і дало назву вёсцы – *Тухавічы* [4].

2) Назва ўтворана ад прозвішча *Туховіч* [18].

У

Ураджайная. Да 1971 года – Вошкаўцы. Назва сімвалічная, дадзена ў гонар высокіх ураджаяў [18].

Ф

Федзюкі. Першы пасяленец вёскі – *Фёдар Кухар*. Праз некаторы час непадалёку ад бацькі пачалі будавацца яго сыны. Такім чынам, вёску, якая пачала развівацца, спачатку і называлі то Федзюкі, то Кухары. У 1915 годзе за ёй афіцыйна была зацверджана назва Федзюкі.

Флер'янова. З гістарычных крыніц вядома, што назва вёскі паходзіць ад імя *Фларыян*. Так у гонар свайго бацькі, вядомага беларускага філосафа і тэолага Фларыяна Бохвіца, яго нашчадкі назвалі свой маёнтак – *Фларыянава*. З цягам часу пераўтварылася ў *Флер'янова* [18].

Х

Хахлуха. *(мікр.)* Сажалка ў вёсцы Русінавічы каля маста праз раку Свідроўка, водамі якой яна і сілкуецца. Назву атрымала

ад мянушкі гаспадара сядзібы, дзе была вадакачка і за якой знаходзілася сажалка. Утворана ад слова “*хахол*” – выхадзец з Украіны.

Хацяж. У сярэднім Палессі старажылы атаясамлівалі тэрмін “*хотава*” з рускім “починок, нача, новина”, што найбольш верагодна [18].

Хваінка. *(мікр.)* Мясцовасць за некалькі кіламетраў ад вёскі Галаўнінцы, на мяжы з тэрыторыяй вёскі Крывошын. Тутэйшыя мясціны былі адметныя тым, што тут былі добрыя сенакосы, людзі тут назапашвалі сена. Назва мясцовасці, магчыма, пайшла ад хвойных дрэў.

Ц

Цна. *(гідр.)* 1) Назва ракі пайшла ад стараславянскага слова “*цсна*” – цесна, вузка [14].

2) Назва балтыйскага паходжання, ад слова *tusnas* – ціхая [18].

3) Паходзіць ад славянскага “*дзесная*” (правая) з трансфармацыяй у “*дсна*”, а затым “*цна*” [18]. Пры гэтым дадзенае слова пераводзіцца як “правы”, але Цна з’яўляецца левым прытокам Прыпяці.

Цыгань. Назва-этнонім ад імя народнасці цыган, але верагодна таксама і сувязь з мянушкамі [18].

Ч

Чарнавокага поле. *(мікр.)* У Тальмінавічах – малады лес, а раней – луг, дзе некалі касілі сена для кароў.

Чашчы. *(мікр.)* Месца каля вёскі Жарабковічы, дзе раслі зараснікі, пераважна бярэзнік.

Чвыры. Магчыма, паходзіць ад слова “*жвір*” (пясок, пясчаная глеба) з трансфармацыяй *жв-* у *чв-* на мясцовы дыялект.

Чорныя акопы. *(мікр.)* Балота каля вёскі Русінавічы. Назва кажа сама за сябе: чорныя дзіркі, вокны багны.

Чортава акно. *(мікр.)* Лагчына каля ракі ў вёсцы Сваятычы, вельмі топкае месца.

Ш

Шавялёўка. *(гідр.)* Рэчку назвалі Шавялёўкай таму, што рух вады ў ёй быў занадта павольны. А магло быць і так, што ў даўнія часы тут вадзілася шмат рознай рыбы: як разгуляецца ў воднай стыхіі, то сама рэчка нібы жывая, варушыцца (шавялілася) [14].

Шавялі. 1) Назва ўтворана ад слоў, якія ўзыходзяць да асноў са значэннем “паляўнічыя, маладзец, работнікі” і т. п. [18].

2) Назва-тэрмін з сэнсавым значэннем “западзінка (рэльефа)” [18].

Шведскія магілы. *(мікр.)* Урочышча на беразе вадасховішча Шчара на паўночны захад ад вёскі Мыслабаж у лесе. Чатыры насыпы складаюць курганны могільнік.

Шкляроў лужок. *(мікр.)* Лужок у полі на ўсход ад вёскі Мыслабаж, каля якога жыў чалавек па прозвішчы *Шклянік*, па-вулічнаму – *Шкляр*.

Шмуля. *(мікр.)* Урочышча каля вёскі Востраў, у напрамку аграгарадка Мілавіды.

Шнуркі. *(мікр.)* Некалі цяперашняя вуліца Свянтэцкага ў Крывошыне была вельмі кароткая: ад цэнтральнай дарогі ўсяго

тры-чатыры хаты. У канцы вуліцы людзям выдзялялі вельмі вузкія кавалачкі зямлі. Мабыць, адсюль і такая назва.

Шпількаўшчына. *(мікр.)* Лес паміж вёскамі Альхоўцы і Задвор'е.

Шчара. *(гідр.)* 1) Назва ракі, левага прытоку Нёмана. паходзіць ад латышскага слова "*шаурс*" (*saras*), што азначае "вузкі" [4, 14, 16, 18].

2) Значэнне крывізны мае гідронім *Шчара*. У гэтай назве рэалізавана старажытная каранёвая аснова *шчар-*, якая мае значэнні "гнуць, згінаць"; "круціць, вярцець" [9].

Шчаснавічы. У аснове назвы – уласнае асабовае імя *Шчасны* – "*шчаслівы*". У старабеларускі перыяд (асабліва ў XVI стагоддзі) было надзвычай папулярным. Толькі "Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага" называе звыш 40 чалавек з такім імем: *Щасный Адамович, Щасный Войткович, Щасный Дрозд, Щасный Карский, Счасный Стасевич, Счасный Ятовтович* і інш. На яго аснове ўзніклі прозвішчы *Шчасны, Шчасновіч*. *Шчасновічы* – нашчадкі *Шчаснага* або родзічы па лініі бацькі з агульным прозвішчам *Шчасны* ці *Шчасновіч* [6].

Шчэрбава. Назва ўтворана ад прозвішчаў *Шчэрба, Шчарбак, Шчарбін* [18].

Шырокія. *(мікр.)* У Зубелевічах – ворыўны масіў па левы бок тракту, які вядзе з Клецка праз Жарабковічы на Ляхавічы.

Я

Яз. *(мікр.)* Урочышча на беразе ракі Шчара. *Яз* – гэта запруда на рэчцы для лоўлі рыбы. Назва ўрочышча, па словах старажылаў вёскі Мыслабаж, гэта вытворнае ад слоў *везці, перавезці* – гэта значыць, была пераправа ў гэтым месцы.

Язвенкі. *(мікр.)* Месца каля Рэпіхава, на поўдзень у бок возера Нетчын.

Яловец. *(мікр.)* У Зубелевічах – масіў, зарослы кустамі ядлоўцу.

Ямы валасацкія. *(мікр.)* Месца ў вёсцы Сваятычы, дзе раней быў пабудаваны графам Зібер-Плятэрам цагляны завод.

Яцкаўшчына. Існуе паданне пра чалавека з непрывычным для тутэйшых мясцін імем – *Яцка*, які купіў у мясцовага пана тры валокі зямлі. Нямала заплаціў за зямлю, бо вартая яна была гэтага – урадлівая, шчодрая. Толькі не разлічыў свае сілы Яцка, не здолеў дагледзець усю плошчу. Вось і вырашыў аддаць частку зямлі сялянам у арэнду. Праходзіў час, і побач з Яцкавай сядзібай пачалі будавацца ягоныя арандатары. Неўзабаве ўтварылася тут невялікае паселішча, якому людзі далі назву *Яцкаўшчына* – ад імя гаспадара гэтай зямлі [3, 18].

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Брэстчына: назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў / складанне, запіс, апрацоўка А. М. Ненадаўца. – Мн.: Беларусь, 1995. – 431 с.
2. Ведзьма-прыгажуня : легенда // Будаўнік камунізму. – 1990. – 13 кастрычніка.
3. Ёсць край такі… : гістарычна-літаратурная хроніка / У. М. Лаўрэнаў [і інш.]. – Баранавічы: РУПП “Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня”, 2003. – 427 с.
4. Легенды і паданні Ляхавіцкага краю : гісторыка-краязнаўчы зборнік / укл. і літ. апарцоўка С. В. Чарновіча. – Баранавічы: РУПП “Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня”, 2004. – 96 с.
5. Легенды Ляхавіцкага краю (папка) – Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма.
6. *Лемцюгова, В. П.* Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды / В. П. Лемцюгова. – Мінск: Литература и Искусство, 2008. – 416 с.
7. У легендах і паданнях // Ляхавіцкі веснік. – 1999. – 7 ліпеня.
8. Легенды і паданні Ляхавіцкага краю / падрыхтавала Марыя Тулейка // Репетитор. – 2006. – № 10. – с. 83–85.
9. *Рогалеў, А. Ф.* Назвы Бацькаўшчыны (тапанімія Беларусі) / А. Ф. Рогалеў. – Гомель : Барк, 2008. – 216 с.
10. *Турыянскі, М.* Ляхавіцкі замак: быль і легенды / Міхась Турыянскі // Ляхавіцкі веснік. – 2001. – 19 мая.
11. *Турыянскі, М.* Ляхавіцкі замак: быль і легенды / Міхась Турыянскі // Ляхавіцкі веснік. – 2001. – № 35.
12. *Станіславовіч, М.* Куршынавічы. З гісторыі вёскі / Марына Станіславовіч // Краязнаўчая газета. – 2009. - № 41. – С. 6.
13. Адкуль пайшла назва // Ляхавіцкі веснік. – 1993. – 4 мая. – С. 2.

14. *Лаўрэнаў, У.* Цячэ рэчка... / У. Лаўрэнаў // Ляхавіцкі веснік. – 1998. – 28 сак. – С. 2.

15. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2. – Мінск: 2009. – 863 с.

16. *Жучкевіч, В. А.* Чаму так названа / В. А. Жучкевіч. – Мн., 1969. – 119 с.

17. Адкуль пайшла назва // Ляхавіцкі веснік. – 1993. – 23 красавіка. – С. 3.

18. *Жучкевич, В. А.* Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Мн., 1974. – 448 с.

19. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна. – Мінск: БелЭН, 1989. – С. 410–411.

20. *Стыкуць, У.* Свята ў Русінавічах / У. Стыкуць // Ляхавіцкі веснік. – 1997. – 8 кастр. – С. 3.

21. *Татаринович, Ю.* Города Беларуси. Брестчина / Ю. Татаринович. – Минск: Смэлток, 2010. – С. 28–29.

22. *Пракоф'ева, С.* Дваранскае гняздо. Ураджайная / С. Пракоф'ева, І. Пракоф'еў // Ляхавіцкі веснік. – 2003. – 8 лютага.

23. *Дучыц, Л.* Сакральная геаграфія Беларусі / Л. Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2011. – С. 48.

24. *Лапіч, А.* Дзень Рамашак / Аліна Лапіч // Ляхавіцкі веснік. – 2012. – 8 верасня. – С. 4.

25. *Лапіч, А.* Пад борам цякла рэчка / Аліна Лапіч // Ляхавіцкі веснік. – 2012. – 8 снежня. – С. 9.

26. *Буйкевіч, К.* Куточак Палесся родны і любімы. Свяціца Ляхавіцкага раёна / Кацярына Буйкевіч // Ляхавіцкі веснік. – 2015. – 22 ліпеня. – С. 4–5.

27. Атлас Гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён: Дадатак да 6-томнай "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" / Л. У. Языковіч [і інш.]; пад агульнай рэд. Л. У. Языковіч. – Мн.: БелЭн, 2004. – 160с.: іл., карт.

у пачатак ***спіс населеных пунктаў***

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА 5
НАЗВЫ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ 6
ТАПОНІМЫ ЛЯХАВІЧЧЫНЫ 11
СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ 66
ЗМЕСТ 68



у пачатак ***да зместу*** ***спіс населеных пунктаў***

У падрыхтоўцы матэрыялаў для выдання прымалі ўдзел бібліятэкары ДУК “Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”



Дзяржаўная ўстанова культуры
“Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма”

МОВА МАЁЙ ЗЯМЛІ
Тапанімічны слоўнік Ляхавіччыны

Складальнік *Т. Л. Арлоўская*
Карэктар *Л. П. Мацулевіч*
Камп’ютарная вёрстка *Л. П. Мацулевіч*

www.liblh.by